[П]РОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Чацвер, [illegible] студзеня 1938 г., №

ЦАНА [illegible] КАП.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення ССПБ і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

ВЯЛІКІ РУСКІ ПАЭТ

Шэсцьдзесят год таму назад памёр Нікалай Аляксеевіч Некрасаў.

Шэсцьдзесят год таму назад абарваліся гукі песень смутку і тугі, песень плачу, якія былі поўны праклёнаў, песень гневу, накіраванага супроць самадзяржаўнага ладу, песень веры ў вялікую рэвалюцыйную сілу народа.

Бязмежна дарагі совецкаму народу людзі, якія віталі яго будучае вызваленне, якія з палымнеючым заклікам да народа пісалі на сцягу соцыяльнага пратэсту:

...Кровь и борьба,
Чтоб человека создать из раба...

Такім чалавекам быў Н. А. Некрасаў. І ў адзнаку глыбокай удзячнасці да паэта—змагара за народнае шчасце свабодныя народы Совецкага Саюза нясуць сёння да яго імя сваю любоў і прызнанне і ўшаноўваюць гэта імя побач з неўміручымі імёнамі народных песняроў — Руставелі, Пушкіна, Шэўчэнка, Горкага, Маякоўскага.

Бліжэйшы друг і аднадумца вялікіх асветнікаў-рэволюцыянераў Чэрнышэўскага і Дабралюбава, які каранямі сваёй творчасці ўвабраў сокі свабодалюбівай паэзіі Пушкіна, — Н. А. Некрасаў з'яўляўся непрымірымым змагаром з самадзяржаўна-прыгонніцкім ладам тагочаснай Расіі.

Малюючы пакуты бяспраўнага, галоднага сялянства, кожным радком сваім паказваючы голад, хваробы, жабрацтва, плач абязволеных дзяцей і жанчын — стогн змучанага народа, Некрасаў яркімі і гнеўнымі вершамі — «кнутом иссеченной музой» — паўстае супроць носьбітаў соцыяльнага зла — пара і памешчыка, паўстае супроць нязменных «дольщиков» на плады працы сялянства — «бога, паря и господина». Побач з забітым, пакорлівым Ерэмушкам, які схіляецца ніжэй за тонкую былінку, абуджаецца новы Ерэмушка — носьбіт варожасці да прыгнятальнікаў, носьбіт імкненняў да братэрства, роўнасці і свабоды; побач з прыбітай жанчынай паўстаюць жанчыны — дзекабрысткі, палкія патрыёткі, прэобразы гераічных жанчын нашай эпохі; і стогн народа ператвараецца ў гнеў, які кліча да барацьбы.

Некрасаў марыў бачыць свой народ свабодным да канца. Яго — рускага дэмакрата не змагла задаволіць рэформа аб «вызваленні сялян», якая выклікала захапляючае выццё ліберелаў. Зоркім вокам рэаліста ён не мог не бачыць, што «вызваленыя сяляне» засталіся абрабаванымі жабракамі, не мог не бачыць таго, што «вместо цепей крепостных люди придумали много иных».

Але невычарпальна была вера Некраса[ва] ў сілу народа, у яго цудоўнае будучае, [як]ое яму суджана было заваяваць. З ве[лізар]най сілай заяўляе аб гэтым паэт у [«Чыгуначнай] дарозе» — творы, які побач з [illegible] паказвае ўжо і пралетарыя. У [«Жал]езнай дарозе»... [тв]оры Некрасаў гаворыць пра рускі [народ, што] ён:

[Вынесе] всё — и широкую, ясную
[Грудью до]рогу проложит себе.
[illegible] — жить в эту пору прекрасную
[illegible]ся—ни мне, ни тебе.

[Па]эт не ўбачыў таго цу[доўнага часу, аб] якім марыў і ў якім [illegible] ўсім сэрцам сваім мы ад[illegible] з сабою.

[illegible] творчасці якога з'ўлялася [illegible] народу і радзіме — ра[illegible] ад усякага прыгнёту,— [illegible] соцыялістычнай эпохі. [illegible] радком, прыкладам уласна[illegible] вучыць нас усёперамагаючай [illegible] яго народа, да сваёй радзімы. [illegible] перамагла ў Некрасаве яго [illegible] станні ў бок лібералізма.

[illegible]аў: «Некрасаў хістаўся, будучы слабым, паміж Чэрнышэўскім [illegible], але ўсе сімпатыі яго былі на [Чэрн]ышэўскага. Некрасаў па той-жа слабасці грашыў ноткамі лібе[ральнага] ўгодніцтва, але сам-жа горка [аплак]ваў свае «грахі» і публічна каяўся

[Не то]рговал я лирой, но бывало,
[Когда у]грозил неумолимый рок,
[У ли]ры звук неверный исторгала
[Моя] рука...

[«Не]верны гук» — вось як называў [Н]екрасаў свае ліберальна-ўгодніцкія [illegible]. (Т. XVI, стар. 132—133).

[У] сваёй барацьбе з меншавіцкім, ка[деце]кім і іншым смеццем Ленін, у процівагу меншавіцкім поглядам Плеханава, які прыніжаў рэволюцыйнае і мастацкае значэнне Некрасава, неаднаразова спасылаўся на Некрасава, як на [прадстаў]ніка рэволюцыйнага дэмакратызма.

У артыкуле «Памяці графа Гейдэна» Ленін піша: «Яшчэ Некрасаў і Салтыкоў вучылі рускае грамадства ўглядаць пад прыгладжанай і напамаджанай маскай адукаванасці прыгонніка-памешчыка яго драпежніцкія інтарэсы, вучылі ненавідзець двудушнасць і бяздушнасць падобных тыпаў, а сучасны расійскі інтэлігент, які выдае сябе за хавальніка дэмакратычнай спадчыны, належачай да кадэцкай партыі альбо да кадэцкіх падгалоскаў, вучыць народ хамству і захапляецца сваёй бесстраснасцю беспартыйнага дэмакрата». (Т. XII, стар. 9).

Да апошняй хвіліны жыцця Некрасаў не страціў кроўнай сувязі з народам, не страціў веры ў яго магутную сілу, і перад самай смерцю, у цяжкія хвіліны хваробы, ён звяртаўся да народа, як да крыніцы выратавання:

— Я взываю к русскому народу:
Если можешь выручай!

І народ пачуў голас свайго песняра. У дні хваробы тысячамі пісьмаў і тэлеграм народ падтрымліваў свайго любімага паэта.

Імя свайго любімага паэта народ пранёс праз годы.

Некрасаў з намі. У справах і перамогах нашых жыве яго светлае імя. У зроку мінулага вялікі рэволюцыйны паэт, паэт-грамадзянін Н. А Некрасаў, гаворачы аб тым, што Расію шмат у чым абагналі іншаземцы, пісаў сапраўды прароцкія словы:

Но мы догоним в добрый час,
Бо ў грудзях Расіі:
Бежит поток живой и чистой
Еще немых народных сил:
Так под корой Сибири льдистой
Золотоносных много жил.

Совецкі народ, які ўступіў ужо ў трэцяе дзесяцігоддзе, з гордасцю можа заявіць, што мары паэта ажыццёўлены, што старая Расія ператварылася ў перадавую ў свеце краіну — краіну перамогшага соцыялізма, краіну чалавечага шчасця.

Некрасаў, які ішоў шляхам грамадзянскай, рэволюцыйнай паэзіі, следам за Радзішчавым, дзекабрыстамі, Пушкіным, Герцэнам, — дорог нам як паэт-грамадзянін, які ўняўся да ўзроўню сапраўднага зблiжэння з народам, як палкі змагар за сцяг рэволюцыйнай, грамадзянскай сапраўднай народнай паэзіі, лепшым прадаўжальнікам і прадстаўніком якой у перыяд созецкай эпохі з'явіўся Уладзімір Маякоўскі.

Трацкісцка-бухарынскія выродкі спрабавалі паклёпнічаць на лінію рэволюцыйнасці і грамадзянскасці нашай совецкай літаратуры, спрабавалі падмяніць яе лініяй эстэтычных вывертаў. Партыя бязлітасна разграміла гэтыя спробы. У рэзультаце жорсткай барацьбы нарадзілася соцыялістычная літаратура. І як змагар у яе радах стаіць вялікі Некрасаў, як лозунг, як заклік гарыць на сцягу совецкай літаратуры яго словы:

Поэтам можешь ты не быть,
Но гражданином быть обязан.

Беларускаму народу Н. А. Некрасаў асабліва дарагі і блізкі.

Ён — вялікі паэт, чалавек вялікага сэрца, убачыў бяспраўнае існаванне беларускага народа, абумоўленае нацыянальным і соцыяльным гнётам царскага самадзяржаўя; ён у неўміручым творы «Жалезная дарога» адлюстраваў невымерныя пакуты працоўнага народа паняволенай Беларусі:

Видишь, стоит, изможден лихорадкою,
Высокорослый, больной белорус:
Губы бескровные, веки упавшие,
Язвы на тощих руках,
Вечно в воде по колено стоявшие
Ноги опухли; колтун в волосах;
Ямою грудь, что на заступ старательно
Изо-дня-в-день налегала весь век...

І ён. вялікі прадвеснік вызвалення. у гэтым бяспраўным народзе, не гледзячы на яго забітасць, змог убачыць затоеную магутную сілу.

І не памыліўся ён. У адным магутным баявым радзе брацкіх народаў ішоў беларускі народ на вялікі штурм старога свету, разам з імі і пры дапамозе іх заваяваў ён сваё права на свабоднае, радаснае жыццё.

Неўміручая слава геніяльнаму паэту вялікага рускага народа!

Слава партыі, якая на адной шостай частцы свету ажыццявіла векавыя мары прыгнечаных!

Слава партыі Леніна — Сталіна!

ВЫСТАЎКА ГРУЗІНСКАГА МАСТАЦТВА

Вобраз правадыра, бацькі і кіраўніка шчаслівых народаў краіны Советаў — вялікага Сталіна стаў дамініруючым вобразам у творчасці мастакоў Совецкай Грузіі. Майстры выяўленчага мастацтва Грузіі шмат работ прысвяцілі лепшым большэвікам, саратнікам І. В. Сталіна. Вобразы магутнага Сталіна і адданых яму лепшых людзей партыі такія-ж ясныя, сонечныя і прыгожыя ў жывапісу грузінскіх мастакоў, як прыгожа совецкая, поўная радасці, Грузія, уваходзячая ў пышна квітнеючае пад сонцам вялікай Сталінскай Канстытуцыі, аднанацыянальнае кавае сузор'е вялікага Совецкага Саюза.

Выстаўка адкрываецца раздзелам партрэтаў правадыроў нашай радзімы, правадыроў сусветнага пролетарыята.

У цэнтры — партрэт І. В. Сталіна работы мастака Джапарыдзе. Майстар здолеў спалучыць у ім скромнасць самага простага чалавека са строгімі, незабыўнымі рысамі дзелавітасці найвялікшага з вялікіх. Адчуваеш, што гэты вобраз мастак выконваў з любоўю і натхненнем.

Вартай вялікага правадыра з'яўляецца скульптура «І. В. Сталін — 1905 год» (бюст), выкананая праф. Нікаладзе.

Вялікі настаўнік пролетарыята В. І. Ленін адлюстраваны ў грузінскім жывапісу прадстаўленым на выстаўцы выдатным партрэтам мастака Вепхадзе. Вылучаюцца таксама два цікавыя партрэты — калектыўная работа, поўная сапраўднага мастацтва — партрэт першага маршала Совецкага Саюза К. Е. Варашылава і партрэт слаўнага барацьбіта за рэволюцыю нябожчыка Серго Орджанікідзе. Лало Кепховелі прадстаўлены ў рабоце мастака Кікіхадзе.

Велізарнае месца на выстаўцы займае раздзел «Гісторыя большэвіцкіх арганізацый у Закаўказзі». Раздзел адкрываецца палатном мастака Таргадзе «Домік у Горы, дзе нарадзіўся Сталін». Далей, паслядоўна і сістэматычна ў мастацкіх работах разгортваецца біяграфія вялікага чалавека і гісторыя большэвізма ў Закаўказзі.

Мастак Вэлгін — «Сталін у юнацкія годы», мастак Гзэмашвілі — «Сталін у юнацкія годы». У абодвух карцінах на фоне прыгожага пейзажа, сярод дзетвары — юны хлопчык, які стаў найвялікшым геніем свету. Ён паказаны жвавым, але разам з тым уважлівым, некалькі задумлівым, які вылучаецца з агульнага асяроддзя. Усё гэта выраша[на] мастакамі без залішняй крыклівасці, мякка, чалавечна.

Вядомы майстар жывапісу Тоідзе прыцягвае ўвагу наведвальнікаў выстаўкі манументальнай работай «Таварыш Сталін выступае на абарону сялян у Картэлікіі ў 1895 годзе».

Не менш каштоўным з'яўляецца другое палатно Тоідзе — «Таварыш Сталін на Рыонгэсе». Мастак Джапарыдзе прадстаўлены радам выдатных работ, з якіх найбольш каштоўнай з'яўляецца «Красавіцкая канферэнцыя 1917 года». Да ліку выдатных карцін раздзелу «Гісторыі большэвіцкіх арганізацый Закаўказзя» трэба аднесці таксама работы: Кутатэладзе — «Палітычная дэманстрацыя рабочых у Батуме» і Вепхадзе — «Сустрэча Сталіна з Леніным у Тамерфорсе».

Рад мастакоў — Хуцішвілі, Штэнберг, Максімавілхі, Санадзе, Налбандзян, Марыяша, Назарэйшвілі — выставілі карціны, якія закранаюць багацейшую тэматыку гісторыі большэвіцкай партыі Закаўказзя і сведчаць аб незвычайных здольнасцях аўтароў. Да лепшых жывапісных работ гэтага раздзелу трэба аднесці партрэт таварыша Берыя — мастака Магалашвілі. Раздзел завяршае работа Караткова «Грузінская дэлегацыя ў Крэмлі». У раздзеле «Гісторыя большэвіцкіх арганізацый Закаўказзя» прадстаўлена таксама скульптура «Сталін — семінарыст» і скульптура таварыша Сталіна (абедзве ў рост) работы Какібадзе. Тут-жа бюст тав. Кірава работы Табадзе.

Раздзел сучаснага совецкага жывапісу ярка сведчыць аб гарачай любві совецкіх мастакоў Грузіі да сваёй радзімы. Тут і пейзаж прыгожага Закаўказзя, і шчаслівае жыццё і багацце палёў і садоў квітнеючай краіны — роўнапраўнага члена Совецкага Саюза.

У раздзеле «Сучасны совецкі жывапіс» прадстаўлен рад майстэрскіх рысункаў Тоідзе да паэмы Шота Руставелі «Віцязь у тыгравай скуры». Скульптар Тапурыдзе паказаў сваю цікавую работу — бюст Шота Руставелі.

Дарэволюцыйнае мастацтва Грузіі прадстаўлена на выстаўцы ў храналагічна-паслядоўнай схеме. Іконапіс —/ X-XI-XII стагоддзі і сярэдневяковое; XIX стагоддзе — вылучаецца работа невядомага мастака «Юнак у чорным» і партрэт Міхаіла Калаўбнелі.

Сярод работ рэалістаў XIX стагоддзя вылучаюцца: «Хлопчык, які іграе на жалейцы» — Берыдзе, «Нізкі паркан»— Мрэліяшвілі, «Дэрвіш» — Зазнашвілі, «Спагнанне падатку на гумне» — Мрэўліяшвілі, а таксама жанрава-бытавыя карціны Тоідзе. Прадстаўлены сярод рэалістаў народны мастак Габашвілі безумоўна з'яўляецца буйнейшым майстрам XIX-XX стагоддзяў. Яго бытавыя партрэты — «Хеўсуры на свяце» і «Самарканд» — буйнейшыя творы, найглыбейшыя па ідэі і высокамайстэрскія па замыслу.

Выстаўка грузінскага мастацтва нагляднa ілюструе галоўныя этапы развіцця гісторыі грузінскага народа. Яна сведчыць аб таленавітасці мастакоў, глыбокіх і здольных, якія прысвяцілі сваю творчасць вялікаму правадыру працоўных таварышу Сталіну, партыі і свайму слаўнаму грузінскаму народу.

Улад. МУРАТ.



У ЦВК СССР

[illegible] снежня 1937 года Цэнтральны Вы[канаўчы] Камітэт і СНК СССР вынеслі па[становы] аб стварэнні Народнага Камісарыя[та] Ваенна-Марскіх Справах СССР.

[Наро]дным камісарам па ваенна-марскіх [справах] прызначаны армейскі камісар 1-га ранга тав. Смірноў Пётр Александравіч.

Намеснікам Народнага камісара абароны СССР і начальнікам Палітупраўлення РСЧА прызначаны армейскі камісар 2-га ранга тав. Мехліс Леў Захаравіч.

[Уш]анаванне памяці Н. А. Некрасава

[illegible]зеня адбылося пасяджэнне праў[лення Са]юза совецкіх пісьменнікаў БССР. [У сувя]зі з 60-годдзем з дня смерці вя[лікага ру]скага паэта Н. А. Некрасава [праўленне] абмеркавала план святкавання.

[illegible]ня ў Доме пісьменніка адбудзец[ца агульн]ы сход пісьменнікаў.

11 студзеня праўленнем Саюза разам з Акадэміяй навук БССР арганізуецца агульнагарадскі юбілейны сход.

Апрача таго, праўленнем Саюза вылучана група дакладчыкаў аб жыцці і творчасці Н. А. Некрасава для буйных прадпрыемстваў горада.

РУСТАВЕЛЕЎСКІЯ ДНІ Ў ТБІЛІСІ

28 снежня 1937 года пленум заслухаў даклад тав. Чаркавіані. Дакладчык расказаў аб барацьбе з ворагамі ў радах грузінскіх пісьменнікаў, аб задачах пісьменнікаў, паэтаў, драматургаў.

Выступілі—перакладчык Руставелі на азербайджанскую мову Самед Вургун, армянскі паэт-ордэнаносец Наіры Зар'ян, пісьменнік М. Лынькоў, І. Шапавалаў і інш.

Пісьменнікаў штодзённа запрашаюць на прадпрыемствы, у навуковыя і культурныя ўстановы Тбілісі.

29 снежня па дакладу аб грузінскай совецкай літаратуры выступалі Тіханаў, Суркоў і інш. Тут-жа народны песняр Казахстана Джамбул выканаў сваю новую песню аб Пушкіне і Шаўчэнка.

30 снежня адбылося ўрачыстае пасяджэнне пашыранага пленума Тбіліскага совета разам з актывам рабочых, служачых і інтэлігенцыі горада Тбілісі. Пасяджэнне пачалося ўступнай прамовай старшыні Руставелеўскага камітэта і старшыні Соўнаркома Грузіі тав. Бакрадзе. Затым з дакладам аб Руставелі выступіў прафесар Кекелідзе.

З прывітаннямі выступалі пісьменнікі, паэты з усіх канцоў Саюза. Усе прамовы прасякнуты гордасцю за вялікую краіну соцыялізма, за ленінска-сталінскую нацыянальную палітыку, якая прывяла да росквіту культуры, да наймацнейшай дружбы ўсіх народаў краіны. Усе выступаўшыя гаварылі пра Леніна і Сталіна, вялікіх правадыроў народа, імёны якіх сустракаліся кожны раз гарачымі авацыямі, прывітаннямі ў гонар партыі большэвікоў, у гонар Сталіна.

На розных мовах гучаць выдатныя вершы аб Руставелі. Стары Джамбул спявае славу Каўказу, славу грузінскаму народу. Піонеры расказваюць, як яны вучацца ў Руставелі.

На пасяджэнні была агалошана пастанова ЦВК Грузіі аб узнагароджанні перакладчыкаў паэмы Руставелі на мовы братніх народаў.

У заключэнне было прынята прывітанне таварышу Сталіну.

Прывітанне ўрачыстага пасяджэння Тбіліскага совета

Правадыру народаў вялікаму СТАЛІНУ

Сем стагоддзяў прамінула, ды, развеяўшы іх цень,
Ўзняўся «Віцязь ў скуры тыгра»—дзіўны, сонечны, як дзень
Агранёны Руставелі — асляпляючы алмаз,
Адалеўшы зрок стагоддзяў, радугай чаруе нас.
Грузію таптали орды, ды паўсгаў на гэты лёс
Наш народ і сімвал волі праз вякі з сабой пранёс.
Ўстала сонца Руставелі над густой заслонай цьмы
І хваленні чалавеку ў ім лавілі прагна мы.
Ні ярмо персідскіх ханаў, ні султанскіх клік прыгнёт
Не маглі асіліць голас, што не моўкнуў сотні год:
«Параздай бяздомным скарбы, вольнымі рабоў зрабі,
І мяне дабром спамянуць, хто прытулак прыдабыў».
Насупор папоўскім козням, самацветы вечных слоў
Ні Кура не паглынула, ні спаліў агонь кастроў.
Кніга, пешчаная лепш, чым пэрлаў чыстая краса,
Дочкам нашым, юным дзевам, упрыгожвала пасаг.
А хто помніў Руставелі, той не ведаў слова страх,
Бо хто піў з той дзіўнай чашы — не палохаўся ў баях!
І бяссмертнага тварэння словы гучныя, як звон,
Завяршалі нашы святы ў часе ўрачыстых дзён.
Ад нізін да горных сакляў горда правячы каня,
Кідаў ён свой заклік палкі, што ў змаганні нас натхняў:
«Не капі, не будзь бяздушным к чалавеку чалавек:
Што раздаў — тваё, што ўтоіў— тое згублена навек!
Тое скарб, што ў сэрцы носім. Земныя аздобы — прах:
Лепш імя сваё ўзвялічыць, чым капіць дабро ў ларцах».
«Лёгкадумнейшым давер'ем шкодзім мы сабе заўжды:
Пазнаем сяброў і блізкіх толькі ў час ліхой бяды.
Карны меч таго насцігне, хто ашуквае людзей:
У судзе, што праўдай судзіць, нават посах расцвіце!»
Ў сонцатварым Тарыэлі, Аўтандзіле, поўным сіл,
Наш народ свабодалюбны веру ў шчасце ўзрасціў.
У часы выпрабаванняў, гнёту, крыўды і пагард
Руставелеўская доблесць сцяг ягоны берагла.
І варожыя навалы пакарыць нас не маглі,
Бо вялі нас к перамозе Ленін, Сталін — два арлы.
І народ грузінскі з рускім, як з сабратам Аўтандзіл,
Разбіваў усе аковы, ў бой на ворагаў хадзіў.
Край адроджан наш, квітнее пад Кастрычніцкай зарой,
Песні ў радасць нам і ружы цешаць нас сваёй красой.
Руставелевы патомкі опеў разносяць па зямлі,
Парсаданавы палацы горда ўсюды узнялі.
Працу славячы і волю, мы вартуем міра сцяг —

Чым краіна горда зараз, гордай чым была ў вяках,
Правадыр наш і настаўнік! Нас вядзі к наступным дням,
Ты вучыў любіць свяцілы, што ў шляху свяцілі нам.
І пад яблынямі Горы мары юныя твае
Былі з сонцам Руставелі; бачыў ты, як на яве,
Сум і слёзы Тарыэля, Дарэджаны плач, палон,
Штурм герояў, львам падобных, і каджэцкіх сцен разгром.
Сёння месх забыты выйшаў на калгасныя палі,
Ў цэх прышоў і сволыч песень між рабочых падзяліў.
Над калыскай маці песню любіць ціха напяваць:
«У імя жыцця жыць трэба і жывым жыццё аддаць!»
Дзіўным песням Руставелі ўторыць рускі і казах,
Ўтораць праўнукі Тараса, паўтараюць на палях
Беларус, азербайджанец, і чачэнец і узбек,
Чутна песня Аўтандзіла ля таежных вольных рэк.
І па ўсёй краіне нашай братні прагучаў завет:
«Дзеля сябра трэба сябру не баяцца цяжкіх бед,
Адгукацца сэрцам сэрцу, пракладаць любоўю пуць —
Без сяброў жыццё не ў радасць, хоць яно салодкім будзь!»
Носім імя Руставелі мы з любоўю у сабе,
Бо дзівосны край паэта даў прыгнечаным цябе.
Мы пяем «Мразал-Жаміер», шлем хвалу ў шчаслівы час
Тым братам, чыя краіна ўзгадавала Ільіча,
Ўсім народам-пабрацімам і героям барацьбы,
Што на гербу напісалі серп і молат баявы.
Непарушна наша вера ў руставелеўскія дні,
Што навекі вечнай дружбай будуць злучаны яны.
Дзе той меч, які-б быў здольны дружбу братнюю рассеч —
Зазвініць клінок бяссільны і паломіцца той меч!
А калі закляты вораг мір парушыць наш, спакой, —
Пойдуць, быццам Аўтандзілы, нашы воіны у бой.
І грузін сумесна з рускім, не таптаў каб люты зброд
Нашы нівы, — пройдуць захад, поўнач, поўдзень і усход.
Ганарымся мы, любімы, што ты — Леніну сабрат
Быў Курою ўзрошчан бурнай для змагання, барыкад.
Непахісны, мудры, родны!
Ты будуеш новы свет
Там, дзе праца—гонар, доблесць, дзе чысцей, чым ружы цвет.
Песні вольнага народа, дзе ўздымае горда сцяг
З партыяй несакрушымай злітая краіна ўся!

Пераказаў у вершах ГЕОРГІЙ ЦАГАРЭЛІ.
Пераклалі на беларускую мову: Р. ЛЫНЬКОЎ, М. КАЛАЧЫНСКІ, А. АСТРЭЙКА.

1878 НІКАЛАЙ АЛЯКСЕЕВІЧ НЕКРАСАЎ 1938

КАМУ НА РУСІ ЖЫЦЬ ДОБРА

ПРАЛОГ


Гаду ў якім — разлічвай сам,
Зямлі ў якой — здагадвайся,
На слупавой дарожаньцы
Сыйшлося сем сялян:
Часова-абавязаных,
Падцягнутай губерніі,
Павету Цярпігорава,
Пустапарожняй валасці,
З сумежных вёсак-сёл —
Заплатава, Дзіравіна,
Разутага, Знябішына,
Гарэлага, Няелага
І Неўражайка 'шчэ,
Сыйшліся, заспрачаліся:
Каму жывецца весела,
Вальготна на Русі?

Раман сказаў: памешчыку,
Дзем'ян сказаў: чыноўніку,
Лука сказаў: папу.
Купчыне таўстапузаму! —
Браты сказалі Губіны,
Іван і Мітрадор.
Стары Пахом пацісянуўся
І кажа, ў зямлю гледзячы:
Вяльможнаму баярыну,
Міністру гасудараву.
А Проў сказаў: цару...
Мужык, як бык: залезе што
У галаву яму,
Калом адтуль не выганіш,
Не выб'еш: упіраюцца,
І кожны за сваё!
Так спрэчкі разгарэліся,
Што думаюць прахожыя —
Мо' скарб знайшлі вандроўнікі
І дзеляць між сабой.
Па ўласнай справе кожны з іх
Адходзіў з хаты раніцай:
Ішоў да кузьні першы з іх,
Другі — ў сяло Іванькава
Пазваць папа Пракофія
Дзіця перахрысціць.
Пахом соты мядовыя
Прадаць нёс у Вялікае,
А два братаны Губіны
З пяньковымі аброцямі
Лавіць каня упартага
На выганец ішлі.
Даўно пара ўжо кожнаму
Пайсці сваёй дарогаю —
Яны-ж радком ідуць!

Ідуць, як быццам гоняцца
Ваўкі за імі шэрыя,
Што далей — то хутчэй.
Ідуць — перамаўляюцца!
Крычаць — не абразумяцца!
А час ідзе, бяжыць.
За спрэчкай не прыкмецілі,
Зайшло як сонца краснае,
Як вечар надыйшоў.
Напэўна-б ночку цэлую
Ішлі — куды не знаючы,
Калі-б ім баба стрэчная,
Карабая Дурандзіха
Не крыкнула: «шаноўныя!
Куды на ноч вы гледзячы
Задумалі ісці?».
Спытала, засмяялася
І, сцебануўшы сівага,
Памчалася наўскач.
— Куды?.. Пераглянуліся
Тут нашы мужыкі,
Стаяць, маўчаць прыцішана...
А ноч даўно прышла,
Заззялі зоры частыя,
У нябеснай вышыні,
Плыў месяц, цені чорныя
Дарогу перарэзалі
Заўзятым хадакам.
Ой, цені! Цені чорныя!
Каго вы не здагоніце,
Каго не перагоніце?
Ды толькі, цені чорныя,
Вас не злавіць — абняць!
На лес, на шлях-дарожаньку
Глядзеў, маўчаў Пахом.

Па-свойму разважаючы.
Нарэшце праказаў:
— «Ну! чорт сваімі жартамі
Нас здорава падвёў!
Здаецца, мы без малага
Вёрст трыццаць адышлі!
Дамоў цяпер вяртацца нам —
Не дойдзем — сіл няма.
Прысядзем, — патамілися,
Да сонца адпачнем!».
Бяду на чорта ўскінуўшы,
Пад лесам пры дарожаньцы
Паселі мужыкі.
Гарыць агонь, зладзіліся,
Два за гарэлкай збегалі,
У гэты час астатнія
Зрабілі кубак з белае
Бярозавай кары.
Гатова і гарэлачка,
Гатова і закусачка —
Гуляюць мужычкі!
Па тры касушкі выпілі,
Пад'елі — заспрачаліся
Ізноў: каму жыць весела,
Вальготна на Русі?
Раман крычыць: памешчыку,
Дзем'ян крычыць: чыноўніку,
Лука крычыць: папу;
Купчыне таўстапузаму, —
Крычаць братаны Губіны,
Іван і Мітрадор;
Пахом крычыць: святлейшаму
Вяльможнаму баярыну,
Міністру гасудараву,
А Проў крычыць: цару!

Забрала горш ранейшага
Задорных мужыкоў,
Спрачаюцца і лаюцца,
Адзін, здаецца, ўчэпіцца
Другому ў валасы...
Глядзі — ужо схапіліся!
Раман за чуб Пахомушкі,
Дзем'ян за чуб Лукі,
А два братаны Губіны
Прасуюць Прова дужага —
Па-свойму ўсе крычаць!
Узнікла рэха гулкае,
Пайшло гуляць — разгульваць,
Пайшло крычаць — пакрыкваць тут,
Як быццам падзадорваць іх —
Упартых мужыкоў.
Цару — направа чуецца,
Налева адгукаецца:
Папу! папу! папу!
І лес перапалохаўся,
З лятаючымі птушкамі,
Звярамі быстраногімі,
І гадамі паўзучымі,
І стогн, і крык, і гул!
Перш на-перш зайчык шэранькі
З-за кусціка суседняга
Падскочыў запалоханы
І наўцёк панёс!
За ім малыя галачкі
Падняўлі на бярэзіне
Сярдзітыя, рэзкі піск.
А тут яшчэ у пеначкі
Дзіця са страху дробнае
Звалілася з гнязда;
Шчабеча, плача пеначка —
Не знойдзе птушанё!
Пасля зязюля сівая
Прачнулася, уздумала
Камусьці кукаваць;
Разоў мо' дзесяць бралася,
Ды кожны раз збівалася
І пачынала зноў...
Кукуй, кукуй, зязюленька,
Закаласіцца хлеб,
Падавішся ты коласам —
Не будзеш кукаваць!
Сем пугачоў зляцелася,
Любуюцца пабоішчам
З сямі вялікіх дрэў.
Смяюцца ўсе паўночнікі!
А іх-жа вочы жоўтыя



Гараць, бы з воску ярага
Чатырнаццаць свячэй!
Варона, птушка хітрая,
Сядзіць на дрэве высака
Над самым над агнём.
Сядзіць, ды чорту моліцца:
Да смерці каб забілі тут
Каторага-нібудзь.
Карова з медным звонікам,
Што з вечара адбілася
Ад пастуха, пачула ледзь
Людскія галасы —
Прышла і утаропіла
Вачышчы на сялян.
Шалёных слоў начулася
І начала, сардэчная,
Рыкаць, рыкаць, рыкаць!

Рыкае неразумная,
Пішчаць птушынкі дробныя,
Крычаць сяляне п'яныя,
А рэха ўторыць ім.
Яно адно клапоціцца
Люд чэсны перадражніваць,
Палохаць баб, дзяцей!
Нідзе з ім не спаткаешся,
А чуць — заўсёды чуецца,
Без цела — а жыве яно,
Без языка — крычыць!
Сава, — замаскварэцкая
Княгіня, — тут-жа кружыцца,
Лятае над сялянамі,
То за зямлю чапляецца,
То за кусты крылом...

Сама лісіца хітрая,
Па бабскай па цікавасці,
Глядзіць на мужыкоў,
Паслухала, паслухала,
І прэч пайшла, падумаўшы:
«А чорт іх разбярэ!»
І сапраўды: спрачальнікі
Наўрад ці зналі, помнілі,
Аб чым яны крычаць...

Бакі як след наклчыўшы,
Нарэшце супыніліся
Сяляне-мужыкі.
З калужыны напіліся,
Вадою асвяжыліся,
Пачаў іх сон хіліць...

Тым часам птушка дробная
Памалу, на поўсажанкі,
Нізком пералятаючы,
Падкралася к агню.
Злавіў яе Пахомушка,
Паднёс к агню, разглядываў,
Казаў ёй: «птушка дробная,
А вострый кіпцюрок!
Дыхну — з далоні скоцішся,
Чыхну — ў агонь укоцішся,
Крану — без сіл пакоцішся,
А ўсё-ж ты, птушка дробная,
Мацней за мужыка!
Акрэпнуць хутка крылейкі,
Цю-цю! Куды ні ўздумаеш,
Туды і паляціш!
Ай ты, птушынка дробная!
Аддай свае нам крылейкі,
Мы царства абляцім,
Паглядзім, паразведаем,
Папросім — і дазнаемся,
Каму жывецца радасна,
Вальготна на Русі?
— Не трэба нам і крылейкаў,
Абы нам толькі хлебец быў,
Хоць па паўпуда ў дзень, —
І так Расію матухну
Нагамі перамералі!
Сказаў пануры Проў.

— Ды па вядру гарэлачкі, —
Да выпіўкі ахвотныя
Браты сказалі Губіны,
Іван і Мітрадор.
— Ды раніцай гурочкаў-бы
Салёных па дзесятачку, —
Казалі мужыкі.
— А ў поўдзень-бы па жбанчыку
Халоднага кваску.
— А вечарам па чайнічку
Гарачага чайку...

Пакуль яны гутарылі,
Кружыла вёртка пеначка
Над імі: ўсё падслухала
І села ля агня.
Цівукнула, падскочыла
І чалавечым голасам
Пахому кажа так:
— «Пусці на волю птушачку!

За птушачку за дробную
Я выкуп добры дам!».
— А што дасі?
— «Дам хлебца я
Табе паўпуда ў дзень
І па вядру гарэлачкі,
Гуркоў салёных раніцай,
У поўдзень квасу кіслага,
А ўвечары чайку!»
— А дзе-ж ты, птушка, дробная,
Браты спыталі Губіны,
Дастанеш хлеб-гарэлачку
На сем нас мужыкоў?
— «Знайсці — вы самі знойдзеце,
А я, птушынка дробная,
Скажу вам, як знайсці».
— Скажы!
— «Ідзіце лесам вы,
Супроць слупа трыццатага
Адмерайце вярсту:
Прыдзіце на палянаўку,
Стаяць на той палянаўцы
Старыя сосны дзве,
Пад гэтымі пад соснамі
Ляжыць схаваная скрыначка.
Вазьміце вы яе, —
А ў чараўнічай скрыначцы
Абрусы самабранныя,
Калі вы пажадаеце,
Пітво-яду дадуць!
Ім ціха вы прамовіце:
Абрусы самабранныя!
Частуйце мужыкоў!
І па жаданню вашаму
І па майму птушынаму,
Паявіцца усё.
Цяпер пусціце птушачку!».

— Чакай! Мы людзі бедныя,
Ідзем у шлях-дарожаньку, —
Ёй адказаў Пахом:
Ты, бачу, птушка мудрая,
Уваж — старую вопратку
На нас заваражы!

— Каб армякі мужыцкія
Ніколі не зносіліся!
Патрабаваў Раман.
— Каб лапцейкі ліповыя
Служылі, не разбіліся,
Патрабаваў Дзем'ян.
— Каб вош, блаха паскудная,
У кашулях не пладзілася,
Патрабаваў Лука.
— Не прэлі каб парцяначкі...
Патрабавалі Губіны.
А птушка ў адказ:
— «Абрусы самабраныя
Чыніць і мыць — прасушываць
Вам будуць... Ну, пусці!...»

Пахом з рукі шырокае
Птушынку ўраз пусціў.
Пусціў — яна маленькая
Памалу, па поўсажанькі,
Нізком пералятаючы,
Дабралася ў дупло.

За ёй зляцела пеначка
І на-ляту дабавіла:
— «Глядзіце, мужычкі!
З'ядобнага ўжывайце вы
Удоваль, колькі ўмесціцца,
Гарэлкі-ж патрабуйце вы
На дзень адно вядро.
Калі-ж вы больш папросіце,
І раз і два — здаволяць вас
І ўсе жаданні вашыя,
А ў трэці быць бядзе!».

І паляцела пеначка
З сваёй любімай птушачкай,
А мужыкі гуськом
Да шляху пацягнуліся
Шукаць слупа трыццатага.
Знайшлі! — маўчком ідуць
Дарогай простай, пэўнаю
Па лесу па вялікаму,
І лічаць кожны крок.
І, як вярсту адмералі,
Убачылі палянаўку —
Стаяць на той палянаўцы
Старыя сосны дзве...

Сяляне пакапаліся,
Дасталі тую скрыначку,
Адкрылі — і знайшлі
Абрусы самабранныя!
Знайшлі і разам крыкнулі:
«Абрусы самабраныя,
Частуйце мужыкоў!».
Абрусы разгарнуліся,
Адкуль у міг з'явілася
Дзве моцныя рукі,
Вядро віна паставілі,
Гару наклалі хлебанька
І зніклі, нібы цень.
— А што няма гурочкаў тут?
— Няма чайку гарачага?
— Няма кваску халоднага?
Усё ўзнікла ў міг.
Сяляне расступіліся
І пры абрусе ўселіся,
Пайшоў тут пір гарой.
Адзін з другім цалуюцца,
Клянуцца, абяцаюцца
Не біцца марна больш,
А з толкам справу спрэчную
Па розуму, па-божаску
Правесці так, як след —
Да хаты не варочацца,
Не бачыцца ні з жонкамі,
Ні з дзеткамі маленькімі,
І ні з дзядамі сівымі
Пакуль ўсе справы спрэчныя
Не вырашаць яны,
І покуль не дазнаюцца
Як ні на ёсць — і правільна,
Каму жывецца радасна,
Вальготна на Русі?
Зарок такі паставіўшы,
Пад ранне, як забітыя,
Заснулі мужыкі.

Пераклалі Анатоль АСТРЭЙКА,
Міхась КАЛАЧЫНСКІ.

ЗАБЫТАЯ ВЁСКА

1.

У бурмістра Ўласа бедная Неніла,
Каб направіць хатку, лесу папрасіла.
Адказаў: дарэмна, — бабка хай не нудзіць!
«Хутка пан прыедзе—нас ён і рассудзіць;
Пан-жа сам убачыць—хатка ўся гнілая,
Скажа даць мне лесу»,—думае старая.

2.

Нехта па-суседству, хцівы абдзірала,
У сялян зямелькі, ды такі не мала,
Адцягаў, адрэзаў жульніцкім манерам.
«Хутка пан прыедзе — будзе землямерам!» —
Думаюць сяляне: «Пан як скажа слоўка,
Дык зямелька наша будзе нашай зноўку».

3.

Пакахаў Наташу хлебароб-хлапчына,
Але немец сквапны на шляху дзяўчыны
Управіцель панскі. «Пачакай, Ігнаша,
Хутка пан прыедзе!»—цешыцца Наташа.
Так, хто-б ні сустрэўся з крыўдаю ці з горам, —
«Хутка пан прыедзе!»—паўтараюць хорам.

4.

У магіле бабка; на чужой зямліцы
У суседа-шэльмы—ураджай пшаніцы;
Той, хто быў падлеткам, ходзіць барадаты;
Хлебароб-хлапчына трапіў у салдаты,
І Наташы мары з ім прапалі недзе...
І няма ўсё пана... пан усё не едзе!

5.

Аж, нарэшце, неяк пасярод дарогі
Шасцярнёю цугам пад'язджаюць дрогі:
На высокіх дрогах, у труне дубовай,
Пан ляжыць здубелы; за труною—но[illegible]
Пан стары адпеты, новы слёзы вы[illegible]зы.
Сеў сабе ў карэту—і памчаўся ў П[illegible]ер,
Пераклаў К. КРАПІВ[illegible]

Я. ШАРАХОЎСКІ

Вялікі паэт-грамадзянін

Н. А. Некрасаў горача любіў сваю радзіму. Ён прысвяціў ёй шмат глыбокіх па думцы і па пачуццю вершаў. Яго вершы — аб закаванай Расіі, аб падняволеным вялікім народзе, які глыбока пакутваў, але які быў поўны сіл і які ў недалёкай будучыні «широкую, ясную грудью дорогу проложит себе». Вялікі рэвалюцыйны дэмакрат глыбока верыў у сілы рускага народа і аддаў яму свой талент. Гэтую сваю веру ў светлую будучыню радзімы, свайго народа паэт умеў выразіць у магутных, мужных радках. Так, у паэме «Няшчасныя» ён пісаў аб сваёй краіне: «В ее груди бежит поток живой и чистой еще немых народных сил: так под корой Сибири льдистой золотоносных много жил».

Мы ведаем, з якой сілай любіў свой народ геніяльнейшы Пушкін, у якога гэта любоў была дзейснай, актыўнай. Яна зблізіла паэта з «багатырамі кованымі з чыстай сталі з галавы да ног» — дзекабрыстамі, якія практычна, узброенай рукой спрабавалі павярнуць Расію на шлях вызвалення. Мы ведаем, з якой сілай любіў народ В. Г. Белінскі, які пісаў, што капіталізм — апошняе зло ў панаванні над працай, які прарочыў рускаму народу светлую будучыню і які шукаў практычных шляхоў для ажыццяўлення народнага шчасця. Н. А. Некрасаў з'яўляецца ў поўным сэнсе прадаўжальнікам іх ідэалаў і шуканняў — у справе грамадска-палітычнага развызвалення Расіі. Яго паэзія ляжыць на вялікай гістарычнай магістралі, якая пачалася з дзекабрыстаў і праз Герцэна, рэвалюцыйных дэмакратаў прахозіць у наш сённяшні дзень да партыі большэвікоў, да волевага совецкага чалавека — будаўніка сацыялізма.

Тэмай творчасці Некрасава быў народ, яго жыццё і пакуты, яго думы і спадзяванні. Як паэт-грамадзянін, паэт «помсты і жальбы», Некрасаў знайшоў сябе ў значнай ступені пад уплывам гуртка Белінскага, з якім ён зблізіўся ў 1842 годзе. К гэтаму часу Некрасаў ужо выпусціў першы зборнік вершаў «Мечты и звуки», які вельмі сурова быў ацэнены Белінскім у «Отечественных записках». Цяпер-жа Белінскі дае вельмі станоўчы водзыў аб яго вершах «Радзіма» і «У дарозе». Белінскі ўбачыў у гэтых вершах імкненні паэта служыць народу, а паколькі сам крытык у гэты час прапаведваў неабходнасць грамадскага служэння літаратуры, то зусім зразумела іх высокая ацэнка з боку Белінскага. Пра вершы «У дарозе», «Калыханка», «П'яніца» Белінскі пісаў: «...Яны прасякнуты думкаю, гэта не вершы да дзяўчыны альбо месяца, у іх шмат разумнага, талковага і сучаснага». Для таго, каб поўнасцю ўявіць сабе, наколькі супадаў пункт гледжання Некрасава і Белінскага адносна беззмястоўных вершыкаў аб месячным ззянні, г. зн. паэзіі, у якой не ставіліся грамадскія пытанні, досыць прыгадаць жахлівы малюнак, які ў вершы «Чыгунка» («Железная дорога») паказваецца Ванюшу «при лунном сиянии». Гэта быў просты здзек з традыцый зняслілўшай сябе дваранскай паэзіі. Як паэт, Некрасаў знайшоў сябе ў пратэсце супроць нікалаеўскай рэчаіснасці, у барацьбе супроць бурпрыгонніцтва, у сатырычным паказе буржуазна-дваранскага грамадства, у апяванні пакут і рэвалюцыйных імкненняў народных мас

Яшчэ з дзіцячых год у Некрасава засталіся вельмі цяжкія ўражанні ад жыцця прыгонных сялян. Яго бацька вельмі жорстка абыходзіўся з сялянамі, трымаў цэлы гарэм прыдворных палюбоўніц, здзекваўся з безабароннай маткі. Гэтыя вобразы дзяцінства пазней, калі Некрасаў сфармаваўся як рэвалюцыйна-дэмакратычны паэт, значна дапамаглі яму ў бічаванні самадурства і жорсткасці памешчыкаў. Гэтыя вобразы скарыстаны ў цэлым радзе яго твораў і ў прыватнасці ў вершы «Радзіма».

И вот они опять, знакомые места,
Где жизнь отцов моих, бесплодна и пуста,
Текла среди пиров, — бессмысленного чванства,
Разврата грязного и мелкого тиранства;
Где рой подавленных и трепетных рабов
Завидовал житью последних барских псов...

Некрасаў адмаўляў прыгонніцтва не толькі з пункту гледжання ўзаемаадносін паміж памешчыкам і прыгонным селянінам, г. зн бязлітаснай эксплаатацыі апошняга, але і з пункту гледжання спустошанасці маральных і этычных норм памешчыцкага жыцця. Напрыклад, у «Праўдзівым чалавеку» ён паказвае як «дабрачынны» памешчык, «живя согласно с строгою моралью», даводзіць да пагібелі жонку сябра, селяніна і ўласную дачку. У гэтым творы Некрасаў проста-такі дае прататып шчадрынскага Іудушкі Галаўлёва.

Рэзка накіраваны супроць памешчыкаў і такія творы Некрасава, як «Тройка» і «Агароднік». У іх таксама жыццё селяніна супрацьпастаўлена жыццю памешчыка. У «Тройцы» паэт паказвае беспрасветную долю прыгожай сялянскай дзяўчыны:

От работы и черной и трудной
Отцветешь, не успевши расцвесть,
Погрузишься ты в сон непробудный,
Будешь нянчить, работать и есть.

Вершам «Агароднік» паэт хоча сказаць свайму чытачу, што «знать, любить не рука мужику-вахлаку да дворянскую дочь».

Прыехаўшы ў Пецярбург зучыцца (у 1838 годзе), Некрасаў убачыў, што і ў горадзе існуюць тыя-ж полюсы беднасці і багацця, сваволля і прыгнёту, што і на вёсцы. Пецярбургскія ўражанні даюць яму матэрыял для твораў на гарадскую тэматыку, у якіх ён сатырычна паказвае гарадскіх паразітаў, — ліхвяроў, генералаў, буйных чыноўнікаў, глыбока спачуваючы гарадской беднаце, якая знаходзілася не ў лепшым становішчы, чым прыгоннае сялянства.

У Пецярбургу паэт стварае рад надзвычайных твораў аб гарадской беднаце, аб людзях, кінутых нечалавечымі ўмовамі на дно жыцця. Асабліва ярка выяўляецца грамадзянская тэма ў творчасці Некрасава пасля зблізкэння яго з гуртком Белінскага. Ужо ў творах 40-х год выяўляюцца галоўныя асаблівасці некрасаўскай паэзіі, як паэзіі грамадзянскай тэмы, паэзіі служэння народу, паэзіі пратэсту супроць прыгонніцтва і паказу сацыяльных несправядлівасцей у жыцці тагачаснага горада.

Некрасаў, як паэт глыбока народны, узняў грамадзянскую, палітычную тэму на небывалую вышыню. З цягам часу рос і мацнеў, рабіўся больш сталым яго талент і з паэта, які адлюстроўваў настроі прыгонных сялян і гарадской беднаты, ён робіцца сапраўдным ідэолагам рэвалюцыйнай дэмакратыі.

Некрасаў пісаў пра народ і для народа, і ён гэта зусім выразна ўсведамляў. Калі ў 1847 годзе Тургенеў і Боткін сказалі Некрасаву, што адна адукаваная свецкая жанчына не знаходзіць паэзіі ў вершы «Еду ли ночью по улице темной», то Некрасаў заявіў, што ён піша не для свецкіх людзей. «Я вас яшчэ больш напішу і здзіўлю, — сказаў Некрасаў, — калі выкажу вам сваю адкрытую думку, што маё аўтарскае самалюбства было-б зусім задаволена, каб хоць пасля маёй смерці рускі мужык чытаў-бы мае вершы».

Некрасаў пачынае рваць сувязі з былымі сябрамі з дваранска-ліберальнага лагера, бо ўжо к канцу 40 год пачало выяўляцца рэзкае разыходжанне ў поглядах лібералаў і дэмакратаў на вузлавое пытанне эпохі — пытанне аб адносінах да прыгонніцтва і прыгоннікаў. Лібералы заклікалі да гуманных адносін да прыгоннага селяніна, не закранаючы асноў прыгоннага ладу. Рэвалюцыйныя дэмакраты пачалі барацьбу супроць прыгонніцтва, каб яго знішчыць. Некрасаў рашуча стаў на бок апошніх. Паступова зжываючы некаторыя зрывы і лібералізм, ён к канцу 50-х год робіцца адным з самых блізкіх сяброў Чэрнышэўскага і Дабралюбава ў іх барацьбе за грамадска-палітычнае развызваленне Расіі.

У 1847 годзе Некрасаў пачаў кіраваць журналам «Современник», ён сабраў вакол яго лепшыя рускія літаратурныя сілы таго часу. У журнале супрацоўнічалі: І. С. Тургенеў, Л. Н. Талстой, Ф. М. Дастаеўскі, М. Е. Салтыкоў, Н. Г. Чэрнышэўскі, Н. А. Дабралюбаў і інш. Рэакцыянеры розных колераў, а пасля разрыву Некрасава з лібераламі — і некаторыя з лібералаў усякім чынам ганьбілі журнал, бо з цягам часу ён усё больш і больш рабіўся баявым органам рэвалюцыйнай дэмакратыі, карыстаючыся вялікім поспехам сярод чытачоў.

Пра адносіны масавага чытача да твораў Некрасава, можна меркаваць па тым з якой небачанай для таго часу хуткасцю разыйшоўся першы збор яго твораў, які вышаў у Маскве ў 1856 годзе. Атрыманыя ў Пецярбургу 500 экземпляраў выдання разыйшліся літаральна за два дні. Песні «помсты і жальбы» былі блізкія сэрцу масавага чытача, ён бачыў у іх рэалістычны паказ свайго жыцця, яны дапамагалі яму зразумець прычыны яго цяжкога становішча, яны вучылі яго змагацца з рознага роду паразітамі і крывасмокамі. Цяжка пераацаніць значэнне паэзіі Некрасава ў развіцці рускай грамадскай думкі. Цяжка пераацаніць значэнне Некрасава як аднаго з галоўных стваральнікаў рэвалюцыйна-дэмакратычнай эстэтыкі, якая бачыла мэту паэзіі ў развызваленні магутных сіл рускага народа.

За доўгую паэтычную дзейнасць Некрасавым створаны найярчэйшыя вобразы народнага жыцця і паднявольнай працы. У 1858 годзе ён стварае адзін з лепшых сваіх твораў «Размышленні ля параднага пад'езда», у якім з вялікай агідаю і абурэннем паказвае вяльможу, які лічыць «жизнью завидною упоение лестью бесстыдною, волокитство, обжорство, игру...» Вяльможа гоніць ад свайго параднага пад'езда сялянскіх хадакоў, якія ашукаліся, спадзяючыся, што ён для іх што-небудзь зробіць. Паэт бачыць, што «великою скорбью народной переполнилась наша земля», і ён не ідэалізуе цярплівасці, а наадварот, апелюе да пачуцця абурэння, ён хоча бачыць народ «проснувшимся, исполненным сил». Ён хоча бачыць яго барацьбітом, свядомым тварцом свайго жыцця. У гэтым-жа плане напісана і «Песня Ерёмушку», у якой возчык спявае дзіцяці:

Будешь редкое явление,
Чудо родины своей;
Не холопское терпение
Принесешь ты в жертву ей:
Необузданную, дикую,
К угнетателям вражду,
И доверенность великую
К бескорыстному труду.

Некрасаў заклікаў народ адкінуць «халопскую цярплівасць» і замяніць яе «необузданной, дикой к угнетателям враждой», звяртаўся да творчага, волевага пачатку рускага чалавека. У 1860 годзе Некрасаў стварае твор аб рацэ «рабства і тугі»—«На Волге», у якім, паказваючы, да чаго прыводзіць «покорность без конца», пытаецца:

Чем хуже был бы твой удел,
Когда-б ты менее терпел?

Калі быў скасаваны прыгон і сялянства было бязлітасна абрабавана, рэвалюцыйныя настроі ў паэзіі Некрасава яшчэ больш узмацніліся. У «Жалезнай дарозе» (1865 год) паэт паказвае ўмовы, у якія паставіла сялянства пасляэформеная рэчаіснасць. Прыгонніцкі гнёт быў заменены капіталістычным. Чыгунка будуецца ў жахлівых умовах працы, на народных касцях:

Прямо дороженька: насыпи узкие,
Столбики, рельсы, мосты,
А по бокам-то все косточки русские...
Сколько их! Ванечка, знаешь ли ты?

Але і ў гэты цяжкі час, калі паэт пераканаўся, што рэформа не толькі не палепшыла, а, наадварот, пагоршыла становішча сялянства, адкрыўшы яму шлях да паўперызацыі, ён не страціў веры ў сілы народа, у яго светлую будучыню. У «Жалезнай дарозе» як мы ўжо адзначылі, ён пісаў пра тое, што рускі народ «широкую, ясную грудью дорогу проложит себе».

Некрасава не зламіў і разгром рэвалюцыйна-дэмакратычных сіл. У 18[illegible]61 годзе памёр Дабралюбаў, Чэрнышэўска[illegible]га арыштавалі, пасадзілі ў Петрапа[illegible]лаўку, а пасля саслалі ў Сібір. «Современ[illegible]ник» быў закрыты за рэвалюцыйную прапа[illegible]ганду ў 1866 годзе. Некрасаў і цяпер [illegible] не здае сваіх пазіцый. У 1871-72 гадах [illegible] ён стварае гістарычную паэму «Дзекаб[illegible]рысткі», якая па настрою была вельмі [illegible] блізкай семідзесятніцкай моладзі, якая натх[illegible]няла іх на барацьбу супроць самадзяржа[illegible]ўя. У паэме даецца надзвычай моцнае а[illegible] паэтызаванне палітычных ссыльных, ворага[illegible] мадзяржаўя, апаэтызаванне пакут з[illegible] рэвалюцыйныя погляды і дзейнасць. А[illegible] «Дзекабрыстак», з твораў, напісаных [illegible] апошняе дзесяцігоддзе, асабліва вылучак[illegible] па «Сучаснікі» і «Каму на Русі жы[illegible] добра» (1865—1875 годы).

«Сучаснікі»—гэта сатырычная паэм[illegible] якая высмейвае рознага роду «ула[illegible] маючых».

У паэме «Каму на Русі жыць добра» паэт, паказваючы пасляэформенную рэчаіснасць, дае цэлую галерэю сялянскіх тыпаў, стварае незабыўныя карціны народнага жыцця. У паэме паказваецца, я[illegible] сем мужыкоў-бедакоў шукаюць «избытк[illegible]ва села», шчаслівага жыцця і нідзе [illegible] не знаходзяць. У гэтым творы маста[illegible] талент Некрасава разгортваецца на поў[illegible] сілу, дасягаючы найвышэйшага разві[illegible]

У 1877 годзе выйшаў апошні збо[illegible] Некрасава «Последние песни», з якога [illegible]тачы даведаліся пра цяжкую хваробу [illegible] і пачалі прысылаць з усіх канцоў [illegible] пісьмы і тэлеграмы з выражэннем [illegible]вання. Пра хваробу паэта даведа[illegible] Чэрнышэўскі, які быў у гэты [illegible] ссылцы ў Сібіры. У пісьме да [illegible] Чэрнышэўскі пісаў: «Калі, як ты [illegible] маеш маё пісьмо, Некрасаў яшч[illegible] працягваць дыхаць, скажы яму, [illegible]рача любіў яго як чалавека, [illegible]кую яму за добрыя адносіны [illegible] я цалую яго, што я перакон[illegible] будзе неўміручай, што буд[illegible] Расіі да яго, геніяльней[illegible] нейшага з усіх рускіх п[illegible] прасіў Пыпіна перадач[illegible] што яму яго словы [illegible] 8 студзеня 1878 го[illegible]

Некрасаў глыбок[illegible] камі паэзіі змага[illegible] Шчаслівы совецкі[illegible] мені глыбокаю [illegible] імя. Імя Некрас[illegible] ручым, як неў[illegible] ён быў.

Н. А. НЕКРАСАЎ

ЖАЛЕЗНАЯ ДАРОГА

(Прысвячаецца дзецям)

Ваня (у фурманскім армячку): — Татка! А хто будаваў гэтую дарогу?
Татка (у паліто на чырвонай падбіўцы): — Граф Пётр Андрэевіч Клейміхель, ясачка!

Гутарка ў вагоне

I.

Слаўная восень! Здаровы і вохкі
Подых яе жывіць сілы душы;
Лёд на рацэ, неўгрубелы і крохкі,
Роўна-б той цукар стаццелы ляжыць.

Вокала лесу, што ў мяккай пасцелі,
Выспацца можна — спакой і прастор!—
Лісце паблякнуць яшчэ не паспела,
Жоўтым і свежым ляжыць яго ўзор.

Слаўная восень! Марозныя ночы,
Ясныя, ціхія дні...
Ганьбы ні знаку ў прыродзе! Асочча,
Іваімшэлыя багны, і пні —

Хараша ўсё пад святлом месяцовым,
Родную ўсюды я Русь пазнаю...
Шпарка лячу я па рэльсах сталёвых
Думаю думу сваю...

II.

Добранькі татка! Навошта ў змане
Кемнага Ваню трымаць?
Вы мне дазвольце пры месяца ззянні
Праўду яму паказаць.

Праца была гэта, Ваня, вялікасная —
Не па плячу аднаму!
Цар ёсць на свеце: цар гэты бязлітасны,
Голад празванне яму.

Водзіць ён арміі; судны к прычалам
Гоніць; збірае ў арцелі касцоў;
Ходзіць за плугам; стаіць за плячамі
У муляроў, у ткачоў і краўцоў.

Ён вось сагнаў сюды масы народныя.
Шмат іх — ў цяжкой барацьбе,
Даўшы жыццё гэтым нетрам бясплодным,
Смерць набылі тут сабе.

Прама дарожанька: насыпы вузкія,
Слупікі, рэльсы, масты.
А па баках-жа ўсё костачкі рускія...
Колькі іх! Ваня, ці ведаеш ты?

Ша! вось пачуліся воклічы грозныя!
Тупат і скрыгат зубоў;
Цені мільгнулі паўз шыбы марозныя...
Хто там? Натоўп мерцвякоў!

То напярэймы бягуць за вагонамі,
То адбягуцца ў адхон...
Чуеш іх спеў?.. «Люба ў ноч гэту сонную
Працы сваёй бачыць плён!

Рвалі мы сілы пад спёкай, пад холадам,—
Гнуліся спіны дугой, —
Жылі ў зямлянках, змагаліся з холадам,
Мокнулі, мерзлі, хварэлі цынгой.

Нас рабавалі прайдохі-дзесятнікі,
Секла начальства, з галечы люд ныў...
Ўсё мы сцярпелі, мы—божыя ратнікі,
Мірнае працы сыны!

Нашы плады вы, браты, пажынаеце!
Нам-жа ў зямельцы гніць, вось, адно...
Ці ўсё-ж нас, бедных, дабром спамінаеце,
Ці ўжо забылі даўно?..».

Ты не жахайся пяяння іх дзікага!
З Волхава, з матухны Волгі, з Окі,
З розных куточкаў дзяржавы вялікае—
Гэта браты ўсё твае — мужыкі!

Сорам палохацца, Ваня, паслухай,
Ты не маленькі ўжо!.. Валасам рус,
Бачыш, стаіць, змардаваны трасухаю,
Рослы і хворы зусім беларус:

Губы збялелыя, вочы запаўшыя,
Болькі на сохлых руках;
З веку ў вадзе па калені стаяўшыя
Ногі папухлі; калтун ў валасах;

Ямінай грудзі: рыдлёўкай старанна
Корпаў ён багну штодзень цэлы век...
Глянь на яго больш уважліва, Ваня:
Цяжка свой хлеб здабываў чалавек!

Не разагнуў сваю постаць гарбатую
Ён і цяпер: тупа змоўкнуў сабе
І механічна іржавай лапатаю
Мерзлую глебу дзяўбе!

Звычку да працы яго благародную
Нам-бы не дрэнна з табой пераняць...
Благаславі-ж, Ваня, працу народную
І не забудзь мужыка паважаць.

Ды не бядуй за айчыну любезную...
Досыць меў гора ўжо рускі народ,
Згараў і гэту дарогу жалезную —
Згорае ўсё, што ні дасць ім гаспод!

Згорае ўсё — і шырокую, ясную
Грудзьмі дарогу праб'е ён сабе.
Шкода, што жыць у пару тую шчасную
Не давядзецца — ні мне, ні табе.

III.

Тую-ж хвіліну свісток галаслівы
Гукнуў—і знікнуў натоўп мерцвякоў!
«Бачыў я, татачка, сон...» — палахліва
Ваня сказаў: — «тысяч пяць мужыкоў,

Прадстаўнікі рускіх племя і расы,
Раптам сыйшліся — і ён мне сказаў:
— Вось яны, хто будаваў нашу трасу!..»
Смех генерала узяў!

— Быў я нядаўна ў мурах Ватыкана,
Па Калізею два дні вандраваў,
Бачыў я ў Вене святога Стэфана,
Што-ж... усё гэта народ будаваў?

— Вы прабачайце мне смех гэты дзерскі,
Логіка ваша дзікая крышок.
Хіба для вас Апалон Бельведэрскі
Горш за гліняны гаршчок?

— Вось ваш народ: тэрмы Рыма даванне —
Дзівы мастацтваў — усе расцягаў!
«Я гавару не для вас, а для Вані...»
Ды генерал мне пярэчыць не даў:

— Ваш славянін, англа-сакс і германец
Не будаваць майстры, а — разбураць,
Варвары! дзікае зборышча п'яніц!..
Ад-жа і Ваней заняцца пара;

— Бачыце, зданямі смерці і жалю
Сэрца дзіцячае грэшна пужаць.
Вы лепш дзіцяці цяпер паказалі-б
Светлы бок...

IV.

— Рады, магу паказаць!
Слухай-жа, любы мой: праца натужная
Скончана—рэльсы ўжо немец кладзе.
Мертвых у дол закапалі; нядужыя
Ўсе па зямлянках; рабочых людзей

Даўкі натоўп ля канторы сабраўся...
Моцна патыліцы скрэблі яны:
Кожны падрадчыку вінен застаўся,
Сталі ў капейку прагульныя дні!

Ўсё запісалі дзесятнікі ў кніжку —
Ці прахварэў ты, ці браў што якое:
«Мога, і ёсць тут цяперака лішку,
Ды, вось, глядзі ты!..» Махнулі рукою...

Сінекаптаннік — лабазнік заўзяты,
Тлусты, каржысты, чырвоны, як медзь,
Едзе падрадчык па лініі ў свята,
Едзе работы свае паглядзець.

Праўдны народ расступіўся чын-чынам...
Выцер купец потны твар, і ў канцы
Кажа, узяўшыся ў бокі карцінна:
«Ладна... нішто... малайцы! малайцы!..

З богам, цяпер і дадому, — вітаю!
(Шапкі далоў — калі я гавару!) —
Бочку рабочым віна выстаўляю
І х т о ш т о в і н е н — д а р у!..»

Нехта «ура» закрычаў. Падхапілі
Гучна, больш дружна, працяжна... Аж глядзь:
З песняй дзесятнікі бочку кацілі...
Тут і лянівы не змог устаяць!

Выпраг народ рысакоў — і купчыну
Паімчаў па дарозе: — ур-ра-а-а!..
Цяжка больш радасную карціну
Намаляваць, генерал!?..

Пераклаў Р. ЛЫНЬКОЎ.

„ШАЛЁНЫЯ ГРОШЫ" А. ОСТРОЎСКАГА

У рускім драматычным тэатры БССР

Рускі дзяржаўны драматычны тэатр БССР узбагаціў свой рэпертуар п'есай з класічнай спадчыны. Ён паказаў гледачу «Шалёныя грошы» А. Н. Астроўскага.

«Шалёныя грошы» — камедыя, напісаная А. Н. Астроўскім у 1870 годзе. Гэта — вострая сатырычная п'еса, якая бічуе тагочасны так званы «вышэйшы свет» — пошлых і пустых арыстакратаў.

Персанажы камедыі — прадстаўнікі адмыраючага класа феадалаў-памешчыкаў, якія ідуць, адкідаючы ўсякія прынцыпы маралі і сумлення, на ўсялякія авантуры і подласці, каб захаваць прывычнае разгульнае жыццё. Ім у камедыі супроцьстаяць прадстаўнік узыходзячага ў гэты час гістарычную арэну новага эксплаататарскага класа капіталістаў—памешчык, які стаў гандляром і прамыслоўцам, Васількоў і прадстаўнік кулацкай вярхушкі вёскі—Васіль Іванавіч.

П'еса паказвае, як на змену старой арыстакратычнай знаці — класа, які страціў ужо магчымасць развіцця, прыходзіць клас капіталістаў-прамыслоўцаў.

Прасякнутая вострай сатырай, накіраванай супроць эксплаататарскіх класаў, гэтая камедыя Астроўскага, варожа сустрэчаная ў момант свайго з'яўлення тагочаснай афіцыйнай крытыкай, заслужана прыцягнула ўвагу ў наш час. Пастаноўкай яе Дзяржаўны рускі тэатр зрабіў каштоўную і патрэбную справу.

Для раскрыцця вобразаў камедыі Астроўскага не патрэбны карыкатуры, завострана-гратэскавы паказ іх. Наадварот, рэалістычная трактоўка стварае найбольшыя магчымасці для сатырычнага паказу людзей чужога нам грамадства, асуджанага і загінуўшага эксплаататарскага класа.

Гэта зразумелі і пастаноўшчык камедыі засл. арт. рэсп. В. В. Кумельскі і акторы — выканаўцы асноўных роляў.

Проста, рэалістычна, строга прытрымліваючыся замыслу Астроўскага, вядзе ролю Васількова арт. В. В. Стальскі. Перад гледачом — энергічны памяркоўны капіталіст, які ўсё падначальвае сваёй мэце—накапленню багацця, здабыццю грошай. Размовамі аб «складанай» псіхіцы, «чулым» сэрцы ён маскуе сваю жорсткасць эксплаататара, халодную бессардэчнасць чалавека, які вышэй за ўсё ставіць камерцыйны разлік, бюджэт. Ён — прадстаўнік узыходзячага капіталістычнага класа — прымушае ўсё і ўсіх служыць сваім мэтам. В. В. Стальскі здолеў праўдзіва раскрыць гэты цэнтральны вобраз.

Правільна зразумеў і ў патрэбным сатырычным плане распрацаваў ролю Целяцева засл. арт. БССР В. В. Кумельскі. Целяцеў — арыстакрат, які разарыўся, але не страчвае аптымізма, бо яшчэ палітычная ўлада ў руках яго класа. Ён цынічна жартуе, выкрываючы сапраўдную сутнасць — нікчэмнасць і пошласць — самога сябе і блізкіх яму прадстаўнікоў арыстакратычнай знаці.

Парушае агульны план рэалістычнага, прасякнутага сатырай паказу нікчэмных людзей, тыпаў арыстакратыі 60-х гадоў мінулага стагоддзя вобраз старога «зажнага барына» Кучумава, створаны арт. С. В. Паляковым.

С. В. Палякоў пайшоў не па лініі рэалістычнай распрацоўкі вобраза, а даў гратэскавы, амаль карыкатурны паказ яго. Пастаноўшчык і актор, працуючы над вобразам Кучумава, захапіліся танным камедыйным штукарствам, што знізіла сацыяльную вартасць і сатырычную завостранасць гэтага персанажа камедыі Астроўскага.

Складаная задача па распрацоўцы вобраза Лідзіі Чэбаксаравай стаяла перад арт. З. В. Свінарскай. Лідзія — маладая арыстакратка, якая ведае толькі адны законы — «законы свету і прыстойнасці». «Калі ўсе носяць такое плацце, дык я, хоць памры, ды надзявай» — вось сутнасць гэтага закона. Лідзія ўзасобіла ўсе адмоўныя рысы арыстакратыі—драпежнасць, амаральнасць, авантурыстычнасць. Вобраз расце і ўскладняецца з кожнай дзеяй. Паказаць гэты рост, поўнасцю раскрыць вобраз — вось задача, што стаяла перад артысткай.

Лідзія некалькі аднастайная ва ўсіх дзеях. Актрыса слаба паказала яе перспектыву, унутранае развіццё, але ўвогуле праўдзіва стварыла збіральны тып арыстакраткі. «Я, як матылёк, без залатой пыльцы жыць не магу»—у гэтых словах Лідзіі — яе сутнасць, яе ідэалы. Здабыццё грошай, шалёных грошай — сэнс і мэта яе жыцця.

Вобраз старой Чэбаксаравай — маці Лідзіі, пошлай і [illegible] мяшчанкі, удала раскрыла арт. І. М. Байрон.

Некаторая недапрацаванасць ёсць у выкананні ролі Глумава арт. Е. Л. Рамапоўскім. Актору трэба было больш выразна акрэсліць гэтага пашляка і авантурыста—тыповага прадстаўніка тагочаснай арыстакратычнай моладзі. Усе гэтыя персанажы —«лепшыя людзі свайго грамадства і свайго часу—паўстаюць перад гледачом без ілжывых масак, ва ўсім сваім непрыглядным абліччы. А. Н. Астроўскі накіраваў супроць усю сілу свайго сатырычнага таленту. І ў тым, што майстэрска зробленыя Астроўскім тыпажы знайшлі ў асноўным правільнае сцэнічнае раскрыццё—поспех актораў і пастаноўшчыка.

Да недахопаў пастаноўкі, якія зніжаюць мастацкую вартасць яе, трэба аднесці наяўнасць натуралістычных, неўласцівых п'есе і непатрэбных спектаклю дэталяў у сцэнах спаткання Лідзіі з мужам і Кучумава з Лідзіяй (трэці акт).

Мастак Рэйхель добра аформіў спектакль, за выключэннем першай дзеі, афармленне якой занадта спрошчана і не адказвае патрабаванням п'есы.

Пастаноўкай камедыі «Шалёныя грошы» тэатр даў гледачу цікавы спектакль. П'есы А. Н. Астроўскага, прасякнутыя вострай сацыяльнай сатырай, не згубілі сваёй вартасці і цікавасці ў наш час. Яны дапамагаюць нашаму гледачу пазнаваць мінулае з тым, каб яшчэ больш любіць шчаслівую сучаснасць нашай сацыялістычнай краіны.

Р. ЮР.

СОВЕЦКАЯ ІНТЭЛІГЕНЦЫЯ

Наша сям'я вялікая, багатая і ўсебакова адароная. Яе прадстаўнікі — людзі ўсіх родаў «зброі». Побач з «байцамі», узброенымі прыгожымі скрыпкамі, важкімі раялямі і бліскучымі трубамі, стаяць працаўнікі кісці і пяра; побач з вясёлай акцёрскай брацціяй ідуць салідныя акадэмікі. Настаўнік і мастак, кампазітар і ўрач, архітэктар і журналіст, вучоны і пісьменнік, інжынер і адвакат—усе гэтыя людзі аб'яднаны адным словам «інтэлігенцыя».

Слова гэтае на нашых вачах змяніла свой сэнс. Раней ва ўяўленні народа інтэлігент быў адначасова і «барынам». Паны і «інтэлігенты» аднолькава пагарджалі простым народам. Была, праўда, інтэлігенцыя і іншага толку: поўгалодныя, жыўшыя ў халодных хатах народныя настаўнікі, бяссільныя ў барацьбе з эпідэміямі і забабонамі ўрачы, якія самаахвярна працавалі ў глушы... Такіх была меншасць, гэта былі адзінкі.

Мы, працаўнікі мастацтваў, артысты і артысткі былі для так званых «вышэйшых колаў грамадства» забавай. Актора часам не лічылі за разумнага чалавека, з якім можна па-чалавечаму гаварыць.

Але быў і другі глядач—перадавыя рабочыя, студэнты, настаўнікі, якія ночы прастойвалі ў чарзе, каб купіць зручны білет на галёрку. Яны давалі нам маральнае задавальненне. Для іх быў сэнс працаваць і працаваць.

...Праляцелі грозавыя годы магутных патрасенняў—найвялікшай у свеце рэвалюцыі, жорсткай грамадзянскай вайны. Краіна, кіруемая сталінскім геніем, бліскуча завяршыла сваю другую пяцігодку. Мы аглядваемся навакол—і не пазнаем краіну, людзей, саміх сябе, свайго жыцця. Здаецца, змянілася нават паветра, якім мы дышым. У тэатры прышоў народ—той глядач, аб якім мы марылі ўсе годы.

Адыйшла ў нябыццё дарэвалюцыйная інтэлігенцыя, якая была на службе ў правячых класаў, якая супроцьстаўляла сябе народу. Нарадзілася новая совецкая інтэлігенцыя, якой не ведаў раней свет. З класічнай прастатой сказаў аб гэтым таварыш Сталін на VIII надзвычайным з'ездзе Советаў, дэлегатам і членам рэдакцыйнай камісіі якога я мела шчасце быць.

«Гэта ўжо не тая старая заскарузлая інтэлігенцыя, якая спрабавала ставіць сябе над класамі, а на самой справе служыла ў сваёй масе памешчыкам і капіталістам. Наша совецкая інтэлігенцыя гэта—зусім новая інтэлігенцыя, якая звязана ўсімі карэннямі з рабочым класам і сялянствам. Змяніўся, па-першае, склад інтэлігенцыі. Выхадцы з дваранства і буржуазіі складаюць незначны процант нашай совецкай інтэлігенцыі. 80-90 процантаў совецкай інтэлігенцыі — гэта выхадцы з рабочага класа, сялянства і іншых слаёў працоўных. Змяніўся, нарэшце, і самы характар дзейнасці інтэлігенцыі. Раней яна павінна была служыць багатым класам, бо ў яе не было іншага выхаду. Цяпер яна павінна служыць народу, бо не стала больш эксплаататарскіх класаў. І іменна таму яна з'яўляецца цяпер роўнапраўным членам совецкага грамадства, дзе яна разам з рабочымі і сялянамі, у адной упражцы з імі вядзе будоўлю новага бяскласавага сацыялістычнага грамадства».

Вялікая праўда нашага радаснага шчаслівага жыцця ў гэтых словах. Гэтае адзінства з рабочымі і сялянамі, адзінства думак, імкненняў, інтарэсаў адчувае кожны совецкі інтэлігент. Усведамленне непарыўнай сувязі з народам памнажае сілы совецкай інтэлігенцыі, акрыляе яе. Няма ў яе іншых інтарэсаў, акрамя інтарэсаў народа. Няма іншых ідэалаў, акрамя служэння народу і сваёй сацыялістычнай радзіме. У гэтым — яе прызначэнне, яе шчасце, сэнс яе жыцця.

Мы — людзі мастацтва—добра ведаем сілу і значэнне чалавечых пачуццяў. Мы ведаем таксама, якой сілы можа дасягнуць народ пры адзінстве пачуццяў, якія ахопліваюць шматмільённыя масы. Гэтым адзіным пачуццём нашых народаў з'явілася адданасць справе сацыялізма, бязмежная любоў да нашага вялікага Сталіна, да нашай цудоўнай радзімы, гатоўнасць аддаць для яе абароны ўсе свае сілы і ўсё жыццё.

І ці можа быць інакш! Совецкая інтэлігенцыя атулена ўвагай і любоўю ўсёй краіны. Кожны наш поспех заўважаюць, вітаюць, заахвочваюць. Дзесяткі і сотні прадстаўнікоў інтэлігенцыі ўзнагароджаны ордэнамі і высокімі званнямі. Таленавітыя мастакі, акторы, пісьменнікі, кампазітары—любімцы народа.

Совецкая ўлада шырока расчыніла дзверы да ведаў і культуры для ўсіх без выключэння. Вучыся, абірай спецыяльнасць, да якой маеш схільнасць, авалодвай культурнай спадчынай, твары сам— заклікае краіна кожнага юнака, кожную дзяўчыну. Совецкая моладзь абавязана апраўдваць давер'е партыі і ўраду выдатнай вучобай. Моладзь павінна радаваць таварыша Сталіна сваімі поспехамі ў навуцы, літаратуры і мастацтве.

Зусім іншыя «універсітэты» прайшлі мы, людзі старэйшага пакалення. Вучыцца мне прыходзілася ўрыўкамі, выпадковымі ўрокамі, нават пачатковай школы не ўдалося скончыць. З зайздрасцю глядзела я на сваіх равесніц, якія вучыліся ў гімназіі.

Не акінуць вокам усяго, што праароблена ў нашай краіне для ўздыму культуры. І зроблена ўсё гэта па сутнасці за якіх-небудзь 16-17 год, бо першыя годы рэвалюцыі пайшлі на барацьбу з белагвардзейцамі і інтэрвентамі. За такі кароткі адрэзак часу столькі вырасла людзей культуры, навукі, тэхнікі і мастацтва. Здзіўляцца трэба!

Маладыя скрыпачы, піяністы выходзяць пераможцамі на міжнародных конкурсах музыкантаў. На нашых вачах выраслі такія кампазітары, як Дзяржынскі, які стварыў ужо дзве цудоўныя оперы, і Дунаеўскі, песні якога распяваюць усюды. Кінокарціны маладых совецкіх рэжысёраў з велізарным поспехам дэманструюцца не толькі ў нас, а і на экранах Амерыкі і Заходняй Еўропы. Маладыя совецкія лётчыкі робяць такія адважныя пералёты, якія выклікаюць захапленне ўсяго чалавецтва.

Зусім іншую карціну мы бачым на Захадзе, у капіталістычным свеце. Там у інтэлігенцыі падрэзаны крыллі. Там гіне культура, навука і мастацтва. Не толькі моладзь—старыя, заслужаныя майстры не могуць часам прахарчавацца. Зачыняюцца і марнеюць тэатры, кіно-студыі, майстэрні мастакоў.

Комунізм—вось тая мэта, да якой упэўнена рушыць магутны совецкі карабель, накіроўваемы геніяльным рулявым, вялікім Сталіным. Усё больш узрастае роля совецкай інтэлігенцыі ў нашым руху да гэтай вялікай мэты.

Совецкі народ абраў сваімі дэпутатамі ў Вярхоўны Совет рад прадстаўнікоў совецкай інтэлігенцыі. Мне выпала вялікае шчасце балатыравацца ў Совет Саюза па Дзяржынскай выбарчай акрузе гор. Ленінграда. Я прыкладу ўсе сілы, каб апраўдаць высокае давер'е народа.

Мы жывем у цудоўны час. Радасна нам у адной упражцы з рабочымі і сялянамі будаваць бяскласавае сацыялістычнае грамадства. Радасна тварыць, несці сваё мастацтва ў масы пад праменнямі Сталінскай Канстытуцыі. Радасна ведаць, што настаў час, калі совецкая інтэлігенцыя разам з усім народам прышла да выбарчых скрынак і перад усім светам прадэманстравала нашу несакрушальную магутнасць, нашу палкую любоў да свайго першага дэпутата, светлага генія чалавецтва—вялікага Сталіна.

Е. П. КАРЧАГІНА - АЛЕКСАНДРОЎСКАЯ. Народная артыстка СССР, дэпутат Вярхоўнага Совета СССР.

Агляд творчасці мастакоў БССР

(VII усебеларуская мастацкая выстаўка)

VII усебеларуская мастацкая выстаўка прысвечана XX гадавіне Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Разам з тым выстаўка з'яўляецца творчай справаздачай мастакоў Совецкай Беларусі за пошні год. На гэтай выстаўцы ў асноўным прадстаўлена моладзь, растучыя маладыя таленты. З старэйшага пакалення мастакоў прадстаўлены В. Волкаў, Кругер, Віер, Кудрэвіч, Гедлэ і нябожчык Ю. М. Пэн.

В. Волкавым выстаўлена новая карціна «Перадача вопыту». Мастак даў карціну пра стаханаўскі рух. Умеючы добра рысаваць, мастак усё-ж далёка не справіўся з асновай карціны — з кампазіцыяй. Совецкі глядач хоча бачыць адлюстраванне стаханаўскага руху ў зразумелай форме, у светлых і радасных фарбах. Аўтару гэта не ўдалося.

Два вялікія палатны на тэму аб вытворчасці далі старыя мастакі Кругер і Віер. Абедзве работы вылучаюцца натуралістычнай трактоўкай фігур рабочых і простым капіраваннем дэталей машын і абкружаючай абстаноўкі. У Кругера яшчэ ў большай ступені, чым у Віера, адчуваецца пасіўны, адлюстравальніцкі падыход да з'яў жыцця. У «Ліцейным цэху» Кругера рухі рабочых вялыя, нежыццёвыя, непраўдзівыя. Няма ў іх сапраўднай кіпучай энергіі нашых рабочых. Таму гэтыя карціны не даходзяць да гледача, не хвалююць яго. Мастакі не даюць тыповага, а абмяжоўваюцца выпадковым, беглым уражаннем пра рэчы і людзей.

Віцебскім мастаком Хрусталёвым і Малкіным (у графіцы) дадзены пейзажы выпадковых куткоў, закінутых старых хатак, перакрыўленых агарож. Такі паказ рэчаіснасці не толькі не тыповы, а проста шкодны. Не могуць хваляваць гледача і работы эцюднага характару, зробленыя, за нязначным выключэннем, непрадумана і наспех мастаком Красоўскім. Напісаныя ім у Крыму мімалётныя, імпрэсіяністкія накіды — павярхоўныя і выпадковыя. Не гледзячы на іх некаторыя каларыстычныя вартасці, яны далёкія ад рэчаіснасці, ад тыповага. Эцюды-пейзажы Мірынгофа, Пікуса і Звенігародскага характарызуюцца натуралістычнасцю і паўнейшай роўнадушнасцю да навакольнага. Індустрыяльныя пейзажы звенігародскага непрыемны сваім фальшывым лоскам і лубачнасцю.

Заслугоўваюць увагі акварэлі Лейтмана. Яны напісаны з надзвычайнай лёгкасцю і майстэрствам.

З мастакоў-пейзажыстаў старэйшага пакалення трэба адзначыць Кудрэвіча і Дучыца. Дучыц дае прыроду праўдзіва і ўдумліва. У яго работах адчуваецца сур'ёзнасць і старраннасць, гэта работы, у якія ўкладзена шмат працы і ўважлівага вывучэння прыроды. Яго тарфяныя ландшафты набліжаюцца да тыпізацыі, да абагулення. Дучыц як пейзажыст расце з кожным годам.

Асноўнае, што прыцягвае ўвагу на выстаўцы — гэта тэматычныя работы мастакоў і партрэты.

Работы на гістарычныя тэмы прадставілі мастакі: Ціхановіч, Забораў, Ахрэмчык і Манасзон. Апошнія два ўзялі адну тэму: «Уступленне Чырвонай Арміі ў Менск». Манасзон ў асноўным з гэтай задачай справіўся, калі не ўлічваць некаторую невыразнасць у кампазіцыі і недапрацаванасць у рысунку. У каляровых адносінах карціна вырашана нядрэнна. Карціна радасная, светлая і дае праўдзівае адлюстраванне гістарычнай падзеі — знамянальнага дня вызвалення Менска ад белапольскіх акупантаў. Слабым бокам кампазіцыі трэба лічыць левы край карціны, дзе ў кутку зацемнены і выглядаюць сілуэтна фігуры сустракаючых. Больш пажадана было-б бачыць іх асветленымі сонцам, радаснымі пры такой урачыстасці і доўгачаканай сустрэчы з героямі-чырвонаармейцамі. Праўда, у цэнтры паказана сустрэча жанчыны з чырвонаармейцам, пэўна з мужам і бацькам дзяцей, якія паказаны на пярэднім плане. На іх тварах свеціцца радасць, але гэтая група ўсё-ж глядзіцца асобна, яна мала звязана з усёй масай. Нам здаецца, што гэты эпізод для такой тэмы — не тыповы. Мастаку трэба было асноўную ўвагу гледача звярнуць на сустрэчу байцоў Чырвонай Арміі з масамі працоўных.

Гэту ідэю імкнуўся вырашыць у аднайменнай кампазіцыі і на тую-ж тэму Ахрэмчык, якому гэта не ўдалося, таму што задачу мастак вырашыў няправільнымі сродкамі, зыбраўшы шэрую, прыглушаную гаму фарбаў, няўважліва аднёсшыся да рысунка і няўдала падабраўшы тыпаж. Карціна мала прадумана і такая гістарычная падзея, як уступленне Чырвонай Арміі ў Менск, выражана без усякага абагулення, без тыпажа. Таленавітаму мастаку Ахрэмчыку, аўтару выдатных жывапісных і ў каларыстычных адносінах цудоўных націюрмортаў, аўтару партрэта Пэна гэтага нельга дараваць.

Больш сумленна і шчыра, хоць зменшым майстэрствам у жывапісу, чым Ахрэмчык, напісаў Е. Ціхановіч сваю кампазіцыю «Таварыш Орджанікідзе» ў разведцы». Фігуры ў рысунку прапрацаваны нядрэнна, але ў кампазіцыі адчуваецца недастатковая прадуманасць. Усё-ж для маладога мастака гэта кампазіцыя — вялікае дасягненне, якое трэба вітаць.

А. Волкавым прадстаўлена кампазіцыя на тэму «Абедзены перапынак у калгасе». Але яна мае шмат недахопаў. Фігуры дрэнна прапрацаваны ў рысунку і ў руху.

Аксельродам таленавіта напісана ў сэнсе жывапісу карціна «Палітгутарка ў полі». Аўтар безумоўна валодае колерам, але рысунак большасці фігур слабы. Ад Аксельрода можна было чакаць лепшага. Ён, як відаць, знаходзіцца яшчэ ў палоне фармалістычных «шуканняў». Справіўся з сваёй задачай у карціне «Чапаеўцы» Забораў. Мастаку ўдалося даць жывы і праўдзівы вобраз легендарнага героя Чырвонай Арміі, — Чапаева. Кампазіцыя групы коннікаў-чапаеўцаў кампактная і прадуманая.

Малады жывапісец Зальцман упершыню выступіў з вялікай кампазіцыяй «На аэрадроме». Адчуваюцца ўдумлівыя адносіны мастака да трактоўкі тыпажу, але жанчына ў ружовай зопратцы ўсё-ж вельмі далёка ад тыпізацыі вобраза, ад рэальнай рэчаіснасці. Жывапісныя вартасці кампазіцыі бясспрэчныя. Уся карціна вырашана ў яркіх, сонечных тонах, што асабліва пажадана ў паказе нашага шчаслівага і радаснага жыцця. У Цзірко ў «Выхадным дні» непраўдзіва, у таннай стракатасці дадзена танцуючая моладзь калгаса. Цэнтральная постаць танцуючага дадзена карыкатурна, не пераканаўчыя і астатнія постаці танцуючых. Асвятленне карціны няправільнае. Адчуваецца поўная непрадуманасць і бездадказнасць у падачы тэмы.

Безумоўна таленавітыя і каларытныя работы Шаўчанка, у жывапісных адносінах гэта выдатна напісаныя рэчы, асабліва нацюрморты і партрэт старога. У фігурных кампазіцыях, не гледзячы на іх жывапісныя якасці, адчуваецца недасказанасць і невыразнасць. «Адпачынак у полі» больш зразумелая рэч, але ў ёй, як і ў «Плытах», рысунак мае заганы. Нехапае самага галоўнага, — прастаты і яснасці раскрыцця тэмы. Як-бы добра не была напісана карціна, але калі яна мала зразумела гледачу, яна застанецца няпоўнакаштоўнай. Аб гэтым трэба падумаць таленавітаму жывапісцу Шаўчэнка. Наша мастацтва павінна быць высока ідэйным, палітычна-завостраным.

У галіне партрэтнага мастацтва на выстаўцы прадстаўлены выдатныя работы мастака В. Волкава. Асабліва добры і майстэрска напісаны партрэт дзяўчынкі. Добры партрэт і дачкі мастака. У ім з глыбокай нагляднасцю і пранікнёнасцю раскрыты псіхалагічны вобраз дзяўчынкі балетка.

Яркія і жывапісныя партрэты дадзены Пашкевічам. Яны каларытныя і інтымныя, напісаны з любоўю і пачуццём. У іх аўтар дастаткова блізка падышоў да раскрыцця вобраза. У сваіх кампазіцыях Пашкевіч менш знаходзіць сябе. Пры ўсіх іх станоўчых якасцях. яны ўсё-ж саладжавыя і далёкія ад сапраўднай карціны. Гэта асабліва датычыць эцюд «Кузнец тарфянога сезону».

У партрэце Ахрэмчыка «Ю. М. Пэн» удала дадзен вобраз старога мастака ў апошнія гады жыцця. Гэта прадуманы і сур'ёзны партрэт, які пакідае добрае ўражанне, — партрэт манументальны і запамінаючыйся.

Старэйшы віцебскі мастак Ю. М. Пэн прадстаўлены на выстаўцы далёка не поўна. Звяртае на сябе ўвагу партрэт «Кравец», у якім дадзен глыбокі сінтэтычны вобраз дарэвалюцыйнай рамесніцкай беднаты горада і мястэчка.

У карціне «Развод» кожная дзеючая асоба — глыбокі псіхалагічны партрэт. У кожны з іх укладзена максімум абагулення, тыпізацыі. Добра, шчыра і па-майстэрску напісаны пейзажы.

Партрэты ў скульптуры дадзены Бразэрам, Азгурам, Анмелевічам і Боханам. Бразэрам добра зроблены партрэт народнага артыста Міхоэльса, у якім скульптар з уласцівай яму экспрэсіяй даў вобраз выдатнага артыста. У асноўным нядрэнна вырашана Бразэрам і постаць Сяргея Міронавіча Кірава. У ёй дадзены бадзёры, радасны трыбун-большэвік, які смела глядзіць наперад.

Азгур у сваіх бюстах упарта працуе над стварэннем вобраза нашага правадыра таварыша Сталіна. Але гэта ўдаецца яму з вялікай цяжкасцю і нават з некаторымі зрывамі. Гэта таму, што скульптару працаваць па фатаграфіі цяжкая задача.

У партрэтах Алтуф'ева і Бразерава Азгур, не гледзячы на непасрэднае і прыпаглае назіранне і вялікую працу, не здолеў усё-ж падыйсці да праблемы партрэта, даў утрыраваныя партрэты-шаржы. Апошнім работам яго характэрны застылыя акадэмічныя позы, штампаваная трактоўка вопраткі. Ад гэтага трэба адыйсці. Трэба бліжэй прыглядацца да натуры, вывучаць і пазнаваць яе.

«Партрэт бацькі» работы скульптара Анмелевіча — граматны, акадэмічны эцюд, але не партрэт. Вобраза ў гэтай рабоце няма. У партрэце таварыша Сталіна Анмелевіч не здолеў падыйсці да раскрыцця вобраза вялікага правадыра і даў незакончаны бюст.

Скульптар Жораў даў фігуру хлопчыка-альпініста. Работа не зусім удалая. Вобраз совецкага, юнага, здаровага альпініста трактаваны няправільна і нетыпова. Адна з найбольш яркіх скульптур на выстаўцы — «Жнея» Бразэра.

Рысунак прадстаўлены на выстаўцы бедны. Выстаўлены, ды і то часткова, рысункі ўсяго некалькіх мастакоў: Бразэра, Фогта, Дакальскай. Гэта загана выстаўкі і большасці нашых мастакоў, якія на рысунак не звяртаюць патрэбнай увагі.

Увогуле выстаўка дэманструе значны творчы рост маладых беларускіх мастакоў. Квітнеючае жыццё нашай сацыялістычнай радзімы, слаўная гісторыя барацьбы за ўладу советаў натхняюць нашых мастакоў. Выстаўленыя карціны сведчаць аб павышэнні ідэйнага ўзроўню распрацоўкі тэм, аб абагульным творчым росце мастакоў Совецкай Беларусі.

БОХАН.



З выстаўкі мастакоў БССР. Карціна Ю. М. Пэна — «Хворы».
Фотарэпрадукцыя І. Каплінскага.



«Сталінскі маршрут». Работа тав. Каўшэўнага, рабочага рэчыцкай запалкавай фабрыкі, зробленая з запалак. Фотарэпрадукцыя І. Каплінскага.

Майстар незвычайных карцін

Пётр Каўшэўны, малады электраманцёр рэчыцкай запалкавай фабрыкі «Х Кастрычнік», доўга прастойваў каля велізарных макальных машын. Барабаны з галоўкамі запалак розных колераў напаміналі яму стракатае летняе поле. Запалкавыя галоўкі блішчэлі то аранжавым заравам, то ззялі як нябесная сінь. Здавалася, прайшоў з велізарнай кісцю добры мастак і прымусіў іх жыць, расцвісці багаццем палявых красак.

І Пётр Каўшэўны вырашыў стварыць незвычайны мастацкі твор, матэрыялам для гэтага ўзяўшы простую запалку.

Каўшэўны падзяліўся сваім праектам са старымі майстрамі запалкавай фабрыкі. Яны па-рознаму аднесліся да яго плана. Адны заявілі, што гэта неажыццявіма: запалка вельмі малааб'ёмная, каб з яе можна было што-небудзь зрабіць; другія спасылаліся на беднасць колераў запалкавай галоўкі: трэція перасцерагалі аб магчымасці ўспалымнення ўжо створанай з такога незвычайнага матэрыялу карціны. Указвалі і на цяжкасці склейвання запалак. Заўвагі былі па сутнасці, але гэта не значыла, што трэба здацца і пакінуць задуманае. Наадварот, у Каўшэўнага ў гэтыя дні з'явілася вялікая цяга да мастацкай працы. Ён параіўся з інжынерамі-лабарантамі і яны абяцалі зрабіць запалкі асобага гатунку, якія-б не ўспалымняліся. Інжынеры, чула настроеныя да пачынанняў маладога таленавітага мастака, вырашылі і другую праблему: яны зрабілі для Каўшэўнага запалкі самых розных колераў — да 25 адценняў. Гэта значна аблягчала творчы працэс і дазваляла без лішняй затраты працы ажыццявіць задуманы рысунак.

Для таго, каб замацаваць запалку на эскізным малюнку, які раней накідваўся алоўкам, Каўшэўны сам прыдумаў металічную сетку з тысячамі дробных адтулінак... Дзесяткі тысяч адтулінак, якія трэба было запоўніць запалкамі, маглі-б спужаць самага цярплівага чалавека. Але Каўшэўны, які рана ўцягнуўся ў вытворчае жыццё і атрымаў добрую працоўную загартоўку, з вялікай стараннасцю прыступіў да цяжкой справы.

Так нарадзілася першая карціна.

Першая карціна Пятра Каўшэўнага была ў цэнтры ўвагі фабрыкі. Каўшэўны прынёс яе ў цэх. Яна пераходзіла з рук у рукі.

— Пётра, няўжо толькі з запалак? — здзіўляліся старыя бывалыя майстры.

— Добра зроблена. Малайчына!..

Тады-ж у маладога электраманцёра нарадзілася мара зрабіць з запалак партрэт любімага Сталіна. На фабрыцы пайшлі насустрач маладому энтузіясту і спецыяльна для яго выпусцілі некалькі тысяч рознакаляровых запалак. Партрэт патрабаваў шмат працы, але выйшаў на-славу. Яго накіравалі ў Маскву. Следам за гэтым малады мастак зрабіў з запалак здзіўляючы сваім падабенствам партрэт Уладзіміра Ільіча, карціну «Ільіч і Сталін у Горках», партрэт А. С. Пушкіна. Партрэта геніяльнага майстра слова ён паслаў на пушкінскую выстаўку ў Маскву.

Усяго ў Каўшэўнага да 20 работ з запалак. Дзве яго самыя значныя работы — партрэт Сталіна і карціна «Паўночны полюс» былі выстаўлены ў Менску на выстаўцы народнай творчасці.

Пётр Каўшэўны — малады камуніст, таленавіты народны самародак. Упартай творчай працай ён дамогся выдатных поспехаў у стварэнні мастацкіх работ.

Е. САДОЎСКІ.

ЗДОЛЬНАЯ МОЛАДЗЬ

Гледачы прыціхлі ў чаканні новага нумара — выступлення самадзейнага калектыва медпрацаўнікоў Віцебска.

На сцэне аркестр, хор, вядучы. Выконваецца мантаж «Песні аб радзіме», з якім з вялікім натхненнем выступаў калектыў на выбарчых участках Віцебска. Спявае 18-гадовая Сапожнікава. Словы песні напаўняюць сэрцы слухачоў радасцю і гордасцю за сваю шчаслівую радзіму. Маладая спявачка ўклала ў простыя словы песні ўсю сваю душу і песня гучыць заклікам, баявым клічам. Да канца мантажа слухач жыве, дыша гэтай песняй і сам пачынае спяваць.

Так пачалося другое аддзяленне фінала 1-й усебеларускай мастацкай алімпіяды саюза медсанпрацы.

Гэтая алімпіяда паказала, як высока ўзрасла культура беларускага народа, якая вялікая яго любоў да сацыялістычнай радзімы.

Калі раней самадзейныя калектывы мелі ў сваім рэпертуары дробныя мастацкія творы, дык зараз яны імкнуцца да працы над вялікімі мастацкімі формамі.

Самадзейны калектыў Оршы паказаў оперу «Наталка Палтаўка». Ён рыхтаваў оперу без рэжысёра, стварыў усім калектывам. І не гледзячы на тое, што большая частка выканаўцаў не зусім справілася з ролямі, опера пакідае добрае ўражанне.

Выканаўца ролі Наталкі — тав. Кушнер здолела ярка раскрыць вобраз беднай украінскай дзяўчыны. Тав. Кушнер валодае добрым голасам і можа пры настойлівай вучобе і дапамозе вырасці ў добрую оперную спявачку. І ўвесь калектыў патрабуе ўвагі і дапамогі.

На сцэне зноў тав. Сапожнікава. Яна выконвае яўрэйскія жанравыя песні. Яе сустракаюць апладысментамі. Здавалася-б, што не ведаючы яўрэйскай мовы, цяжка зразумець сэнс песні. Але песні былі выкананы так майстэрска, жэсты былі такія рэальныя, што сэнс песень зразумелі ўсе. Трэба сказаць, што выканаўца адчувае і перажывае кожнае слова, жыве тым, аб чым спявае. Зала грымнула апладысментамі. Гледачы ўзбуджана гаварылі: «Цудоўна! Маладзец!»

На сцэну выйшаў жаночы хор бабруйскага ваеннага шпіталя, і зноў зала грымела апладысментамі. У гэтым хоры асабліва вылучаюцца тт. Фадзеева і Мінчонак, якія валодаюць добрымі галасамі.

Самай рэдкай і нечаканай з'явай быў жаночы духавы аркестр Менскага медінстытута. Гэта адзіны жаночы аркестр ва ўсёй БССР, які толькі нядаўна арганізаваўся. На яго трэба звярнуць асаблівую ўвагу. Аркестру трэба даць добрага кіраўніка.

Шмат здольных людзей выступала ў рознастайных жанрах мастацтва, шмат добрых рэчаў было выканана, — усё гэта гаворыць аб тым, што беларускі народ багаты талентамі-самародкамі.

К. Ц.

ЧЭРВЕНЬСКІ САМАДЗЕЙНЫ ГУРТОК

Пры чэрвеньскім доме соцкультуры тры месяцы назад быў арганізаваны самадзейны драматычны гурток. За прайшоўшы час гурток паказаў інсцэніроўку аповесці Н. Астроўскага «Як гартавалася сталь» і п'есу бр. Тур і Шэйніна «Вочная стаўка». Работа над першай п'есай дала добрыя вынікі: спектакль атрымаў далатную ацэнку мясцовых гледачоў. Гледачы адзначылі добрае выкананне ролі Паўла Карчагіна тав. Тарасікам (работнік РВК), а таксама ўдумлівую работу ўсяго калектыва.

У бліжэйшы час драмгурток выязджае з падрыхтаванымі пастаноўкамі ў калгасы і на фабрыку «Труд» (Калодзецкі сельсовет).

Не ўмаляючы каштоўнасці работы самадзейнага драматычнага калектыва над вялікімі п'есамі, патрэбна ўсё-ж адзначыць, што пагарджанне малымі формамі, пагарджанне паказам мясцовай народнай творчасці значна зніжае вартасць работы чэрвеньскага драмгуртка.

Неабходна ўказаць на недастатковую ўвагу да мясцовай самадзейнасці з боку як раённых, так і цэнтральных арганізацый. Дом народнай творчасці БССР абмежаваў сваю дапамогу самадзейнаму калектыву прысылкай п'ес, і то без неабходных рэжысёрскіх тлумачэнняў. РайАНА (загадчык Вашук) не забяспечвае дом сацыялістычнай культуры сродкамі.

Раённыя арганізацыі павінны забяспечыць нармальны рост і вучобу самадзейнага гуртка чэрвеньскага дома сацыялістычнай культуры.

Г. ФРЫД.

Палітычнае недамысле

Мастакі БССР з вялікай зацікаўленасцю рыхтаваліся да выстаўкі, прысвечанай 20-годдзю Кастрычніка. Яны чакалі, што іх работы будуць прагледжаны шырокімі масамі працоўных і атрымаюць належную ацэнку гледачоў, мастацтвазнаўцаў, крытыкаў.

Але сектар выяўленчага мастацтва Упраўлення па справах мастацтваў і аргкамітэт Саюза савецкіх мастакоў не забяспечылі гэтага. Не было зроблена афіцыйнага адкрыцця выстаўкі з дакладам аб творчасці мастакоў БССР. Шырокія колы грамадскасці не былі нават паведамлены аб адкрыцці выстаўкі. Арганізатары выстаўкі не паклапаціліся запрасіць на прагляд яе і мастакоў братніх саюзных рэспублік, думкі якіх аб выстаўленых работах былі-б вельмі каштоўнымі для нашых мастакоў. Нічога не было зроблена для таго, каб выстаўку наведалі экскурсіі з прадпрыемстваў, пісьменнікі, работнікі навукі, прадстаўнікі Чырвонай Арміі.

Гэтую нядбайнасць арганізатараў выстаўкі прадэманстравалі і заключны дыспут, які не прыцягнуў шырокай грамадскасці, прайшоў без удзелу яе, не ўзняў на патрэбную вышыню творчых пытанняў.

Замест разгортвання масавай работы вакол выстаўкі арганізатары яе паспяшылі выстаўку закрыць.

Гэта больш чым бестурботнасць арганізатараў выстаўкі, гэта палітычнае недамысле.

А. ЗАБОРАЎ.

АБ „БАДЗЁРЫХ РЫТМАХ“ Р. ЛЯПІЧА

У № 9—10 журнала «Полымя Рэвалюцыі» змешчана вялікая ў памеры праца тав. Ляпіча пад назвай «Песні будаўніцтва» (аб вершах Янкі Купалы апошніх год). Артыкул гэты мае ў сабе рысы адной пашыранай у нас крытычнай «школкі», якая не афармляла свайго існавання спецыяльнымі маніфестамі, але якая тым не менш рэальна існавала і існуе дагэтуль. Сутнасць яе ў тым, што яна давяла да лагічнага завяршэння агульныя ўстаноўкі вульгарнага сацыялагізма ў літаратуры.

Уласна кажучы, у прымяненні да артыкула Ляпіча аб Купале вельмі рызыкоўна гаварыць аб якіх-небудзь агульных метадалагічных заганах, настолькі грашыць ён у элементарных патрабаваннях, прад'яўляемых да работы аб паэзіі. Артыкул уяўляе сабой ад пачатку да канца суцэльнае агульнае месца, напоўненае, аднак, усялякімі недарэчнасцямі, казусамі. Некаторыя з іх варта прывесці.

Тав. Ляпіч у сваім артыкуле вельмі часта прыводзіць тэрмін «народнасць слоўна-мастацкіх сродкаў», прычым ні чытачу, ні, відаць, самому аўтару незразумела, што, уласна кажучы, трэба разумець пад гэтым тэрмінам — ці то блізасць да мастацкіх сродкаў народнай творчасці, ці то агульную якасць нашай літаратуры — народнасць, механічна перанесеную на асобныя фармальныя кампаненты верша. Вось такіх агульных фармуліровак і сцвярджэнняў у артыкуле Ляпіча — велізарнейшая колькасць.

Улюбёнымі фразамі крытыка з'яўляюцца фразы аб мужным, баявым, цвёрдым тоне паэтычнага голасу Купалы, «аб бадзёрых і радасных аптымістычных танах», аб «баявым аптымістычным тонусе верша», аб «бадзёрым, радасна-аптымістычным настроі верша» і т. д., і т. п.

Аб вершы і канкрэтных яго асаблівасцях Ляпіч гаворыць тонам павярхоўнага дылетанта-пачотчыка. Разбіраючы верш Купалы «Лён», Ляпіч гаворыць аб тым, што ён вызначаецца «прыемнай рытмічнай гармоніяй». Але чаму верш, які вызначаецца гэтай «гармоніяй», з'яўляецца добрым вершам? Ды і наогул, што азначае тэрмін «рытмічная гармонія»?

Вялікая прыхільнасць Ляпіча да падобных фармуліровачак, узятых са старых гімназічных падручнікаў, настолькі яўна дае сябе адчуваць, што часта дзеля яе крытык ідзе на свядомую фальсіфікацыю канкрэтных паэтычных фактаў. Ці можна, напрыклад, сказаць, аб такіх радках як:

Як адцвіў ды як надзеў
Лён галоўкі на сябе....

што «ў іх шмат скульптурна-адчувальных вобразаў» у тым сэнсе, як мы гаворым аб скульптурнай адчувальнасці, скажам, фламандскіх карцін Верхарна? Ні ў якім разе. Ясна, што мы маем справу з вялікай нацяжкай тав. Ляпіча, не больш.

Прыклады крытычнай безадказнасці, праяўляемай Ляпічам можна было-б бясконца памнажаць (наіўная, у лепшым выпадку, ацэнка былліннага эпасу і яго герояў, як прадстаўнікоў «сялянскага індывідуалізма», грубае і павярхоўнае тлумачэнне пейзажа ў вершах Купалы). Трэба ў першую чаргу вызначыць асноўныя прычыны, абумовіўшыя рэзкую няўдачу артыкула Ляпіча.

Мы паўтараем: прычына няўдачы артыкула — у груба-сацыялагічным падыходзе да разбору паэзіі. Скажонае разуменне ідэйна-палітычнага аналізу, вылучэнне абстрактных ідэй з тканіны мастацкага твора, няўменне прасачыць канкрэтна-паэтычныя якасці твора — вось некалькі адзнак падобнага сацыялагічнага падыходу да верша.

«Паэтычная ідэя — не правіла і не догмат. Яна — жывая страсць, яна — пафас» — сказаў некалі Белінскі. Між тым, нашы крытыкі разглядаюць ідэю, як знадворна-павярхоўнае тэматычнае заданне. З поля зроку іх выпадаюць усе тыя жывыя творчыя намаганні паэта, якія ператвараюць гэтае тэматычнае заданне ў «жывую страсць», у «пафас», у гарачую зацікаўленасць тэмай. Пярэчанне ў форме нібы незнарок кінутай Ляпічам фразы аб «ідэях паэтычных твораў», «прайшоўшых праз творчую лабараторыю паэта», — не істотна, паколькі агульным кантэкстам артыкула Ляпіча і яго прынцыповым падыходам да паэзіі гэта самая творчая лабараторыя ператвараецца ў неразгаданую і нерасшыфраваную метафару крытыка. Значна больш пераканаўчае ў кантэксце артыкула другое — памылковае сцвярджэнне Ляпіча аб тым, быццам Купала «свае нагляданні над сучасным жыццём, свае вывады і абагульненні робіць у форме сацыяльна-філасофскіх сэнтэнцый». Залішне гаварыць аб тым, што падобнае сцвярджэнне нічога агульнага не мае з фактычным становішчам рэчаў у паэзіі Купалы, бо яно само па сабе супярэчыць ацэнцы Купалы, як «паэта-грамадзяніна, лірыка». Калі-ж верыць Ляпічу, што Купала сапраўды мае справу з «сацыяльна-філасофскімі сентэнцыямі», а не з жывымі паэтычнымі вобразамі дык які-ж ён тады «паэт-грамадзянін, лірык»? Хутчэй філосаф, ці што ? Эканаміст?

У самым падыходзе Купалы да рэчаіснасці Ляпічам падкрэслена рыса навукападобнасці, разліку, прыстраснага да розных матэматычна-дакладных «прапорцый і дыспрапорцый»; «паэтычная сіла сцвярджэння новага свету прапарцыянальна сіле адмірання трухлеючага свету капіталізма», піша Р. Ляпіч. Купале прыпісваецца метафізічнае ўбогае аперыраванне павярхоўнымі супрацьстаўленнямі, кантрастамі, антытэзамі. У Ляпіча атрымліваецца, што ўсе вершы Купалы будуюцца ў плане кантрасту. «Верш «Дыктатура працы» кампазіцыйна пабудаваны па прынцыпу антытэзы»; верш «Вялікаму Кастрычніку» будуецца «у плане кантраснага супрацьстаўлення»; «кампазіцыйная структура» верша «Сыходзіць вёска з яснай явы» «характарызуецца прыёмам сацыяльнага кантрасту»; у вершы «А ў Вісле плавае тапелец» Купала «свой паказ вядзе ў плане рэзкіх сацыяльных кантрастаў» і т. д. — бясконца, без краю.

Бясспрэчна, у Купалы ёсць вершы, якія будуюцца ў плане кантрастаў. Крытыкам, якія пішуць пра Купалу, неабходна ўмець адрозніць гэтыя вершы ад такіх вершаў, як «Лён», «Сыны», «Сосны», «Выпраўляла маці сына», «Хлопчык і лётчык» і іншых — вершаў, па-сапраўднаму насычаных жывым паэтычным зместам, па-сапраўднаму арганічных і дзейсных. Ляпіч гэтыя вершы недаацаніў, ставячы іх на адным роўні з вершамі і менш дзейснымі. Ды яно і зразумела. Да таго часу, пакуль крытык будзе абмяжоўваць свой вершавы аналіз павярхоўным каталагізаваннем тэмы матываў паэта, не звяртаючы ўвагі на сродкі і метады іх творчага пераўтварэння, — ён не здолее паказаць чытачу, у чым выяўляецца глыбіня паэтычнага таленту такога буйнага паэта, як Купала.

Р. Ляпіч старанна класіфікуе ўсе тэмы, якія так ці інакш закранаў у сваёй творчасці Купала. Ён дае падрабязнейшы, даўжынёй на поўстаронкі, спіс тэм, прычым асноўная тэма Купалы, як паэта-лірыка, яго ўнутраная тэма прайшла па-за ўвагай крытыка. А ў гэтым-жа заключалася задача Ляпіча — паказаць, якім чынам пад уплывам перамог сацыялізма пашыралася лірычная тэма Купалы да памераў шырокага ахвату тэмы барацьбы і будаўніцтва.

Ідэйна-творчая перабудова Купалы, як складанае змаганне ўнутрыпаэтычных якасцей, а не як простае паспешнае пераключэнне на новую тэму, незразумела Ляпічу. Купала-паэт Ляпічам не паказаны. Таму яго артыкул пра Купалу — дрэнны артыкул.

Нельга гаварыць аб паэзіі па-за пытаннем аб яе канкрэтнай функцыянальнай накіраванасці, якая вынікае з асобных якасцей яе, іменна, як паэзіі. Нашай крытыцы трэба пераадолець вульгарна-сацыялагічнае і элементарна-навязчывае ўяўленне аб вершы, механічнае параўнанне твора з рэчаіснасцю (у Ляпіча: «бурна-імклівы рытм выяўляе правільнае разуменне шпаркіх тэмпаў нашага росту», «лірычны рэфрэн «ходзіць май па свеце» наглядна выяўляе сабой усю дынамічную напружанасць свята рэвалюцыйнай еднасці»).

Трэба нашым крытыкам, нарэшце, адкінуць агульную сацыялагічную жвачку.

Г. БЯРОЗКІН.

Дом народнай творчасці БССР

Дом народнай творчасці БССР з'яўляецца цэнтрам, вакол якога павінны групавацца ўсе самадзейныя калектывы і народныя таленты. Арганізацыйная і метадычная дапамога калгасна-саўгасным самадзейным гурткам — аснова работы Дома народнай творчасці.

Ворагі народа зацiралі народныя таленты. Ім не па душы быў велізарны рост культуры беларускага народа.

ЦК КП(б)Б 22 жніўня 1937 года вынес пастанову аб прадастаўленні Дому народнай творчасці памяшкання, але пастанова і да гэтага часу не ажыццёўлена. Дому народнай творчасці прадастаўлен толькі адзін невялічкі пакой, што не дае яму магчымасці разгарнуць работу сектароў.

Не гледзячы на дрэнныя ўмовы, на працягу мінулага года Дом народнай творчасці правёў значную работу. Яркім доказам гэтага з'яўляецца другая ўсебеларуская алімпіяда мастацкай самадзейнасці і выстаўка «БССР за 20 год», у арганізацыі якіх Дом народнай творчасці прымаў вялікі ўдзел.

Больш за трыста майстроў рознастайных жанраў самадзейнага мастацтва, якія ў нізах — на прадпрыемствах і ў калгасах, — паказалі свае работы на выстаўцы.

Дом народнай творчасці ўстанавіў сталую сувязь з самадзейнымі гурткамі раёнаў, аказвае ім метадычную дапамогу, кансультуе, рэкамендуе рэпертуар. Работнікі тэатраў асабліва маладыя акторы, актыўна ўдзельнічаюць у працы Дома народнай творчасці. Гэтая кваліфікаваная дапамога спрыяла шырэйшаму разгортванню і творчаму росту самадзейных калектываў.

Трэба адзначыць, што прафсаюзы не дапамагаюць Дому народнай творчасці ў яго працы. Да самадзейнасці прафсаюзы яшчэ адносяцца па-дзяляцку. З-за адсутнасці сувязі прафсаюзаў з Домам народнай творчасці рэпертуар многіх самадзейных калектываў, падрыхтаваных прафсаюзамі без кваліфікаванай дапамогі, засмечаны халтурай, не адпавядае патрабаванням культурнага савецкага гледача.

Мастацкая самадзейнасць, якая адлюстроўвае вялікі культурны ўздым беларускага народа, патрабуе належнага рэпертуара, які-б адлюстроўваў гераічнае мінулае і квітнеючую сучаснасць Савецкай Беларусі.

Драматургічная секцыя ССПБ і ўвесь ССПБ не задумаліся сур'ёзна над стварэннем рэпертуара для самадзейнасці сцэны. Самадзейныя-ж калектывы прад'яўляюць зусім правільныя патрабаванні аб неабходнасці большай увагі да стварэння рэпертуара.

Песні беларускага народа Дзяржаўным выдавецтвам Беларусі выдаюцца вельмі малым тыражом і да раёнаў амаль не даходзяць, а калі і даходзяць, дык у невялікай колькасці.

У сучасны момант Дом народнай творчасці рыхтуецца да правядзення ўсебеларускага фестываля мастацкага слова. Гэта дапаможа выявіць новыя таленты ў розных галінах мастацтва.

Галоўнымі недахопамі ў працы Дома народнай творчасці з'яўляюцца дрэнная сувязь з Наркамасветы і тое, што Дом народнай творчасці не дабіўся адпаведнай увагі да мастацкай самадзейнасці з боку раённых савецкіх, грамадскіх і партыйных арганізацый.

Прафсаюзы, якія адказваюць за работу самадзейных калектываў на прадпрыемствах, райАНА, дамы сацыялістычнай культуры павінны трымаць шчыльную сувязь з Домам народнай творчасці БССР, дапамагаць яму. Толькі пры гэтай умове Дом народнай творчасці зможа забяспечыць арганізацыйную і метадычную дапамогу калектывам мастацкай самадзейнасці, забяспечыць творчы рост удзельнікаў самадзейнасці.

Ц. ТАРЦОЎ.



Усебеларуская алімпіяда саюза медсанпрацы. НА ЗДЫМКУ: работніца аптэкі № 2 гор. Віцебска Ц. Я. Сапожнікава (злева) выконвае яўрэйскія жанравыя песні; справа — зубтэхнік рабочай амбулаторыі гор. Оршы М. М. Кушнер у ролі Наталкі Палтаўкі. Фота І. Каплінскага.

Радыёперадачы не задавольваюць слухачоў

У нашым друку шмат пісалася аб дрэннай рабоце Радыёкамітэта БССР. Зменена кіраўніцтва Радыёкамітэта, камітэт ачышчаецца ад варожых элементаў, абнаўляецца штат супрацоўнікаў — актораў, літаратурных работнікаў, рэдактароў. Але карэннага паляпшэння ў рабоце няма.

Калі праглядзець перадачы, нават за апошні час, дык убачым, што праграмы іх складаюцца пераважна з трансляцыі радыёстанцый Масквы. Бясспрэчна, трансляцыя радыёстанцый Масквы і гарадоў братніх саюзных рэспублік — неабходная рэч, але яна павінна быць увязана з праграмамі мясцовага вяшчання.

Былое кіраўніцтва Радыёкамітэта распусціла аркестр і зараз Радыёкамітэт не маючы свайго аркестра, пазбаўлены магчымасці даваць радыёслухачам высокаякаснае музычнае вяшчанне. Праграмы музычнага вяшчання складаюцца ў большасці з трансляцыі грамафонных пласцінак і тонфільмаў, прычым многія з іх трансліруюцца па некалькі разоў у дзень.

Літаратурныя рэдактары Радыёкамітэта БССР зусім не цікавяцца патрабаваннямі радыёслухачоў. Свае перадачы яны складаюць амаль выключна з вершаў. Хоць вершы і цікава слухаць, але перадача іх па цэлай гадзіне без музычнага суправаджэння вельмі стамляе слухача. Трэба адзначыць і невысокую якасць выканання вершаў артыстам Бірыла.

Аддзел дзіцячага вяшчання складае свае праграмы ў большасці з апавяданняў, без музычнага суправаджэння, якое так падабаецца дзецям. Ні аднаго разу не было арганізавана выступлення дзіцячага тэатра ля мікрафона. Часам матэрыял, які падаецца для дзяцей, зусім не падыходзіць для дзіцячай аудыторыі.

З усіх дыктароў Радыёкамітэта добра вядзе перадачы толькі тав. Батвінік. Астатнія вельмі часта дапускаюць скажэнні, няправільна вымаўляюць словы і з-за гэтага атрымліваюцца недарэчнасці і скажэнні сэнсу ў перадачах.

СНК БССР павінен дэтальна разглядзець работу Радыёкамітэта і праверыць людзей, якія працуюць там, каб забяспечыць радыёслухачам Савецкай Беларусі высокаякасныя, цікавыя перадачы.

РАДЫЁСЛУХАЧ.

ФОТА-НАРЫС



Квітнее сацыялістычны Узбекістан. НА ЗДЫМКУ: куток парку Дома Чырвонай Арміі ў гор. Ташкенце. (СФ).



Тэатр МОСПС (Масква) паказаў прэм'еру новай п'есы К. Фіна «Сыны». Пастаноўка засл. арт. рэсп. С. Бірман. НА ЗДЫМКУ: арт. Г. Любімаў у ролі Паўла. (СФ).



Новыя сучасныя п'есы з жыцця кітайскага пралетарыята ставіць на сваёй сцэне кітайскі тэатр гор. Владзівастока. НА ЗДЫМКУ: сцэна з п'есы «Манчжурскія падзеі». Юны артыст Шура ў ролі сына партызана, арт. Ма-Чан-Сун у ролі японскага афіцэра. (СФ).

Да 60-годдзя з дня смерці Н. А. Некрасава

Менскія бібліятэкі-чытальні ўзмоцнена рыхтуюцца да 60-годдзя з дня смерці вялікага рускага паэта Н. А. Некрасава. У бібліятэках клуба харчавікоў, клуба работнікаў дзяржгандлю, у дзяржаўнай бібліятэцы імя Леніна і гарадской бібліятэцы імя Пушкіна арганізаваны выстаўкі твораў пісьменніка.

З.

Сустрэча пісьменнікаў з піянерамі

3 студзеня ў менскім Палацы піянераў у сувязі з новым годам адбыўся вечар сустрэчы савецкіх пісьменнікаў БССР з піянерамі сталіцы.

У святочна, казачна ўпрыгожаных прасторных залах палаца шчаслівыя, жыццярадасныя дзеці прадэманстравалі пісьменнікам сваю навагоднюю самадзейнасць.

Пісьменнікі і паэты ўдзельнічалі ў гульнях і танцах, арганізаваных піянерамі ля прыгожых ёлак. Народны паэт БССР тав. Колас, пісьменнікі і паэты т.т. Бядуля, Крапіва, Маўр, Александровіч, Куляшоў, Агняцвет, Даўгапольскі, Груб'ян выступілі з чыткай сваіх твораў. Тав. Колас, вітаючы піянераў, абяцаў напісаць у 1938 годзе новую кніжку для дзяцей. Тав. Бядуля пазнаёміў піянераў са сваёй творчасцю.

Вечар скончыўся дэманстрацыяй кінофільма «Салавей».

А. СТ.

Работы мастакоў-самавучак набыты ў дзяржаўны фонд

Упраўленне па справах мастацтваў і Дом народнай творчасці БССР набылі ў дзяржаўны фонд лепшыя творы мастакоў-самавучак, якія былі паказаны на выстаўцы «БССР за 20 год».

У ліку іх: скульптуры «Н. Астроўскі», «Маці» і «Пушкін» — Паварыча, бюст Сталіна (разьба па дрэву) — Хрушчова, «Разведка» (разьба па дрэву) — Івінскага, «Сталінскі маршрут» (мазаіка з запалак) — Каўшэўнага, акварэлі «Галава старога», «Ясны дзень» і «Лэдзечына ў капелюшы» — Перахава, «Ля лукамор'я дуб зялёны» (мастацкая вышыўка) — Дубінінай і інш.

Усяго ў дзяржаўны фонд закуплена 51 работа.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Друкарня «Звязды». Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць раз у пяцідзёнку. Адрас рэдакцыі: Менск, Савецкая 68. тэл. сакр. 25-394, рэдактара 20-831. Уп. Галоўлітбела № 4019